КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 9 (232) ◂ 4 сакавіка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



«КРЫЗІС — НЕ ЗАЎЖДЫ КЕПСКА»

Стар. 5

**ВОСЕМ ЗМОВАЎ І АДНА РЭСПУБЛІКА**

За два месяцы, што прайшлі пасля заканчэння прэзідэнцкіх выбараў, думка пра змову ў галаве «адзінага палітыка» так і не рассмакталася

Стар. 4

**ЛІВІЯ НАПЯРЭДАДНІ РАСКОЛУ**

У заходняй прэсе з'явілася шмат публікацый пра тое, што Лівія як адзіная дзяржава дажывае апошнія дні

Стар. 11

**ПРАСТОРЫ АЛЕСЯ ШАТЭРНІКА**

Стар. 14–15

ISSN 2218-2144

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

**КРЫЖ ВІНЦЭНТУ ГАДЛЕЎСКАМУ**

Нарыс Таццяны Уласенка з цыклу «Шматпакутныя крыжы Беларусі»

ПРАЎДА

# КАТАВАННІ Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ

Вольга ХВОІН

**Прызнанне Алеся Міхалевіча мусіла б стаць для беларусаў «бомбай». Але насамрэч гэта пацверджанне таго, пра што здагадваліся, але маўчалі, закранула толькі вузкую частку грамадства.**



Пра ціск следства падчас судовага працэсу гаварылі расіяне Арцём Брэус і Іван Гапонаў, якія абвінавачваюцца па крымінальнай справе аб масавых беспарадках 19 снежня 2010 года. Іншыя ўдзельнікі судовых працэсаў, што паступова набіраюць абароты, падобных фактаў не ўзгадваюць, як і маўчаць падазраваныя і абвінавачаныя кандыдаты, актывісты апазіцыі, што лавы падсудных яшчэ не дачакаліся. Зрэшты, факты фізічнага і псіхалагічнага ўздзеяння можна знайсці без асаблівых прабле́м, калі перагледзець гісторыю гучных і шараговых спраў. Напрыклад, Мікалай Аўтуховіч, на якога ледзь не тэрарызм «вешалі», сцвярджаў, што на яго аказваўся псіхалагічны ціск, падобнае гаварылі і сведкі па справе.

Варта сказаць, што ў аддзел дазнання жанчын на працу бяруць неахвотна і рэдка. Не ўмеюць жанчыны «калоць» правільна ды і адпаведнымі фізічнымі здольнасцямі не кожная валодае. Хаця, па словах экс-кандыдата ў прэзідэнты Алеся Міхалевіча, чарнавую работу выконваюць не следчыя.

Спачатку Міхалевічу ў СІЗА КДБ прапаноўвалі агучыць для беларускага тэлебачання асуджальную заяву на адрас іншых кандыдатаў у прэзідэнты, якія заклікалі людзей выходзіць на плошчу, калі ж ён адмовіўся, прыйшлі «людзі ў чорным».

«Усё пачалося недзе на чацвёрты дзень, калі ў «амерыканцы» з'явіліся людзі ў камуфляжы, якія не маюць ніякага дачынення да супрацоўнікаў следчага ізалятару. Я не ведаю, хто гэтыя людзі. Я пішу пра іх у заяве ў пракуратуру, хачу, каб пракуратура высветліла, хто яны. Таксама я падаю заяву ўпаўнаважанаму па пытаннях катаванняў Арганізацыі аб'яднаных нацый, — расказаў Алесь Міхалевіч пра тонкасці беларускай палітыкі на скандальнай прэс-канферэнцыі 28 лютага. — Пачалося з таго, што нас гэтыя людзі выводзілі на так званыя вобшукі ў вялікую залю, якую там называюць «спартовай залай». Ставілі на расцяжку, падсякалі ногі так, што людзі стаялі амаль на «шпагаце», так мы стаялі голымі пры дастаткова нізкай тэмпературы па сорак хвілін. Да ўсяго ажыццяўляўся псіхалагічны ціск, калі ззаду падыходзілі і білі нагой па падлозе, каб мы не ведалі, ці пачынаюць нас біць, ці што ўвогуле адбываецца. Калі я не зламаўся, мне пачалі літаральна выкручваць рукі: рукі ў кайданках ззаду падымалі як мага больш высока, так што суставы трашчалі. Вельмі, вельмі балюча. І патрабавалі, каб я выконваў усё, што скажуць супрацоўнікі Камітэта дзяржбяспекі. Гэта крыху суцішылася, калі я пачаў сустракацца з супрацоўнікамі КДБ без пратаколаў, без адваката, з парушэннем усіх працэсуальных дзеянняў. Але перыядычна такі ціск аказваўся. Следчыя рабілі выгляд, што яны нічога пра гэта не ведаюць. Хаця я пра гэта паведамляў намесніку начальніка СІЗА». «Мяне заводзілі ў памяшканне на іншым паверсе, адкуль не будзе нічога чуваць. Крыкі, удары дубінак — нармальны антураж падчас знаходжання ў следчым ізалятары. Канваіры пастаянна б'юць дубінкамі аб сцены ці шчыты, крычаць. Калі людзі, напрыклад, не могуць хутка хадзіць ці ў іх слабае сэрца, на іх так жа ціснуць», — завяршае апісанне турэмнага антуражу палітык.

19 лютага Алеся Міхалевіча выпусцілі з СІЗА КДБ пад падпіску аб нявыездзе. Яму забаранілі расказваць пра ўсё, што там бачыў, у тым ліку і пра людзей у чорных масках. Маўляў, таямніца следства. Да ўсяго Міхалевіч, як ён гаворыць, вымушаны быў падпісаць дамову аб супрацоўніцтве з КДБ «дзеля захавання незалежнасці, самых высакародных мэтаў». Каб вырвацца з засценкаў «амерыканкі» і расказаць праўду аб «канцлагеры ў цэнтры Мінска». Алесь, па сутнасці, кінуў выклік сістэме.

Мужнаму ўчынку Алеся Міхалевіча некаторыя ўжо паспелі даць метку «не веру». Але якая падаплёка ні была б за гэтым, заява мусіць даць ход расследаванню ўмоў утрымання вязняў, нарэшце павінен быць дадзены ўцямны і зразумелы адказ, чаму 20 снежня некаторыя асобы так паказальна для БТ змянілі свае сведчанні і ідэйныя перакананні.

Патрабаваць ад усіх вязняў праўды і толькі праўды пра абставіны следства было б наіўна, але толькі галоснасць можа быць сродкам абароны. Інакш атрымліваецца, як у часы СССР, рэпрэсіўная сістэма якога засноўвалася на сакрэтных інструкцыях, дакументах. Грамадскасць унутры краіны і за яе межамі старанна ахоўвалася ад падобнай інфармацыі, а сутнасць дзяржаўнай улады ведалі толькі выканаўцы — судовыя практыкі, следчыя, адказныя супрацоўнікі органаў МУС і КДБ.

Жаданне дыстанцыявацца ад падобнай інфармацыі натуральнае — падстаўляцца на роўным месцы, калі ёсць і праца, і кілбаса, быццам не лагічна. Але сутнасць дзейснай сістэмы ў тым, што заўтра на месцы Алеся Міхалевіча можа аказацца любы чалавек, незалежна ад віны, стану здароўя, полу. Ды і аказваецца. Прыкладаў, калі метадамі фізічнага і псіхалагічнага ціску змушаюць невінаватых прызнавацца ў тым ці іншым — аж да забойства — злачынстве, хапае.

Напоўніцу зразумець, як дзяржава нявечыць псіхіку (расповеды тых, хто, не першы год жывучы за мяжой, нервова рэагуе на званкі ў дзверы, не рэдкасць) сваіх грамадзян, што маюць віну думаць па-свойму, магчыма хіба што ў такіх умовах. Аднак зычыць суайчыннікам падобнага досведу, каб маглі ацаніць каштоўнасць інфармацыі аб катаваннях, пакуль выглядае блюзнерствам.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ДОПЫТЫ НЕ СПЫНІЦЬ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Махавік допытаў, запушчаны 19 снежня, не спыняецца. «Торгаюць усіх, каб хоць што раскалупаць, каб можна было прышыць гэта да справы», — лічыць актывіст Аляксандр Дзямідаў.**

Яго дапыталі наконт крымінальнай справы аб «масавых беспарадках» у Ленінскім райаддзеле міліцыі Магілёва. Актывісту партыі БХД паведамілі, што яго мабільны тэлефон быў запеленгаваны ў дзень выбараў на плошчы Незалежнасці ў Мінску. Як сказаў старшы оперупаўнаважаны Болатаў, ліст з загадам дапытаць актывіста прыйшоў з Мінска. «Важкіх доказаў, што на плошчы былі беспарадкі, у іх няма», — зрабіў выснову Аляксандр Дзямідаў. Дагэтуль яго выклікалі на допыт у Мінск. Аднак без позвы ён ехаць адмовіўся.

У Маскоўскі РАУС Брэста выклікалі прадпрымальніка Станіслава Федзько. Участковы, які вёў допыт, цікавіўся інфармацыяй наконт беспарадкаў і ўдзелу Станіслава ў акцыі пратэсту. На падобныя пытанні прадпрымальнік адмовіўся адказваць. Пасля гэтага яго сфатаграфавалі на прадмет апазнання сярод асобаў, што бралі ўдзел у акцыі.

У мазырскім гарадскім аддзеле УКДБ у якасці сведкі быў дапытаны па беспарадках праваабаронца Уладзімір Целяпун. Размову з ім вёў камітэтчык Васіль Прыходзька. Праваабаронца пакінуў чэкістам для азнаямлення дакументы, датычныя назірання падчас выбараў. І паабяцаў, што ў свой спіс прадстаўнікоў дзяржструктураў, якіх ён знаёміць з незалежным маніторынгам выбараў у рэгіёне, уключыць у наступную выбарчую кампанію і начальніка КДБ.

А фотажурналістку Ксенію Авімаву дапыталі як сведку ў ГУУС Мінгарвыканкама. Што рабіла і што бачыла 19 снежня — такі быў лейтматыў пытанняў. Як паведаміла Ксенія, ніякія фотаматэрыялы ў яе «пакуль» не забралі.

Па інфармацыі Беларускай асацыяцыі журналістаў, у сувязі з паслявыбарнымі падзеяміператрусы былі праведзены ў 12 журналістаў і ў 4 офісах СМІ. Таксама як сведак па крымінальнай справе «аб масавых беспарадках» журналістаў выклікалі на допыты.

ТЭНДЭНЦЫЯ

# ПАКАЗАЛЬНАЯ РАСПРАВА

Алена ВАРАЖБЕЙ

**2 сакавіка па справе аб «масавых беспарадках» вынеслі тры прысуды. Аляксандр Атрошчанкаў, прэс-сакратар экс-кандыдата Андрэя Саннікава, атрымаў 4 гады, Зміцер Новік — 3,5, Аляксандр Малчанаў — 3 гады. Усіх трох асудзілі да зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.**







Працэс адбываўся ў судзе Фрунзенскага раёна Мінска. Прысуд вынесла суддзя Таццяна Чэркас. Пракурор Таццяна Маладцова патрабавала для падсудных па 5 гадоў пазбаўлення волі.

«Прагнозы дрэнныя. Калі шараговым удзельнікам акцыі пракуратура патрабуе ад 3 да 8 гадоў, то што будзе з арганізатарамі? Там гэтыя рамкі — ад 8 да 15 гадоў», — так пракаментаваў журналістам сітуацыю кіраўнік праваабарончага цэнтра «Вясна» Алесь Бяляцкі.

Хлопцаў абвінавацілі ва ўдзеле ў масавых беспарадках па папярэдняй змове (арт. 293 КК). Малчанава і Новіка — у пашкоджанні дзвярэй Дома ўрада, нанясенні ўдараў рукамі і нагамі па дзвярах. Атрошчанкава — што нанёс «не менш за адзін удар» па шчытах у дзвярным праёме. І ажыццяўляў іншыя «актыўныя фізічныя дзеянні» па пранікненні ў будынак. Малчанаву выставілі і абвінавачанне ў абразе дзяржаўнай сімволікі па арт. 370 КК (зняў з будынка КДБ 2 дзяржаўныя сцягі і кінуў на зямлю).

Адвакаты перадусім даводзілі ў судзе, што «масавых беспарадкаў» не было. Шэсце і мітынг праходзілі мірна. За выключэннем разбітага шкла ўваходных дзвярэй Дома ўрада, ніякіх інцыдэнтаў не было. «Невялікая група асоб — ад 7 да 15 — разбіла шыбы. Білі толькі 5 чалавек, а астатнія — больш за 10 тысяч чалавек — нічога не пашкодзілі, не было ніякіх бясчынстваў і масавых беспарадкаў», — падкрэсліў Вадзім Мушынскі, адвакат Атрошчанкава.

У судзе не пацвердзіўся нават «адзін удар» Атрошчанкава. А выкліканыя супрацоўнікі КДБ зазначылі, што знятыя Малчанавым сцягі не былі пашкоджаныя. Камітэтчыкі іх потым зноў павесілі на месца. То бок, як кажа адвакат Алена Быліна, у дзеяннях падабароннага не было знявагі сімволікі. І што датычыцца беспарадкаў, то гвалту з асобы, падпалаў, разбурэнняў і збройнага супраціву, якія прадугледжвае гэты артыкул, Малчанаў не ўчыняў. А паводле Андрэя Санковіча, адваката Новіка, яго падабаронны не наносіў удараў, а толькі ціснуў на загародку. І яго дзеянні нельга кваліфікаваць як удары і знішчэнне маёмасці.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч лічыць, што такія выракі — гэта тэндэнцыя, і чакаць апраўдальных прысудаў ужо не варта. «Ніякіх доказаў масавых беспарадкаў у судзе так прад'яўлена і не было — ніякіх доказаў узброенага супраціву, падпалаў і ўсяго таго, што следства там ім панапісвала. Нават Малчанаву, які прызнаў, што ён штосьці дзесьці разбіў і зняў сцяг — пакаранне несувымерна, і ўвогуле не тая кваліфікацыя», — сказаў Стэфановіч.

«Гэта проста паказальная расправа», — адзначыў Валянцін Стэфановіч.

Нагадаем, што 10 сакавіка ў судзе Маскоўскага раёна працягнуцца суды над расіянамі Арцёмам Брэусам і Іванам Гапонавым. А таксама — над Дзмітрыем Мядзведзем. Першы прысуд вынеслі 17 лютага Васілю Парфянкову — 4 гады пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму.

СПРАВА

# ГАНДАЛЬ ЛЁСАМІ

**У справе Брэуса і Гапонава Расія дзейнічае ў інтарэсах капіталу. Арцёма Брэуса і Івана Гапонава выпусцяць на волю пасля патаемнага гандлю з Расіяй.**

Такое меркаванне ў гутарцы з «Еўрарадыё» выказаў дырэктар Інстытута нацыянальнай стратэгіі, расійскі палітолаг Станіслаў Бялкоўскі.

У справе расіян абвешчаны чарговы перапынак — да 10 сакавіка. Нагадаем, што іх судзяць за ўдзел у падзеях 19 снежня 2010 года.

Справу часта характарызуюць як палітычны гандаль паміж Беларуссю і Расіяй. Ці быў гэты гандаль насамрэч? Бялкоўскі ўпэўнены, што гандаль быў раней і працягваецца цяпер. «Безумоўна, ён быў і працягваецца. Нягледзячы на нейкае пацяпленне адносінаў паміж Беларуссю і Расіяй у апошні час (не столькі пацяпленне, колькі выглядае такім на фоне пахаладання адносінаў Беларусі з Захадам пасля снежаньскіх прэзідэнцкіх выбараў), усё адно стратэгічныя адносіны сапсаваныя. Аляксандр Лукашэнка не давярае расійскім лідарам, яны не давяраюць яму — прычым гэта складалася цягам некалькіх гадоў. Таму Лукашэнка выкарыстоўвае любую магчымасць, каб патаргавацца з Расіяй наконт розных эканамічных умоваў і параметраў узаемаадносінаў. І лёс расійскіх грамадзянаў — гэта адна з падставаў і прычынаў гандлю», — лічыць палітолаг.

На думку Бялкоўскага, яшчэ можна чакаць фармальнага пратэсту ад МЗС Расіі з нагоды гэтага суда. Але Расія працуе не ў інтарэсах Гапонава і Брэуса, а ў інтарэсах вялікага капіталу. «І калі ў задавальненні гэтых інтарэсаў будуць знойдзеныя кропкі сутыкнення з Лукашэнкам, то тэма Гапонава і Брэуса мякка сыдзе на задні план», — тлумачыць Бялкоўскі.

Хаця Гапонаў і Брэус — шараговыя грамадзяне, Расія ўсё адно абавязаная іх абараняць. Таму, кажа эксперт, беларуская ўлада выкарыстоўвае сітуацыю, каб змусіць Расію да пэўных дзеянняў.

«Зараз на парадку дня эканамічныя ўзаемаадносіны паміж Расіяй і Беларуссю. Безумоўна, у першую чаргу прыватызацыя — размарозка беларускіх актываў, так было ўчора, так ёсць і сёння. Спроба прыцягнуць да прыватызацыі еўрапейскія кампаніі правалілася, ці, як мінімум, адкладзеная. Таму Лукашэнку ў кожным разе давядзецца сёння весці дыялог на гэты конт з буйнымі расійскімі карпарацыямі. А ў гэтым дыялогу будзе добры і лёс расійскіх грамадзянаў, якія знаходзяцца пад арыштам», — падкрэсліў Станіслаў Бялкоўскі.

**Паводле «Еўрарадыё»**

КОНКУРС

# ПРЭС-ФОТА БЕЛАРУСІ

**3 сакавіка ў галерэі «Ў» (г. Мінск) адбылася прэзентацыя альбома работ пераможцаў конкурсу «Прэс-фота Беларусі 2010», а таксама выступ Змітра Вайцюшкевіча.**

Першы незалежны конкурс прэс-фатаграфіі Беларусі адбыўся ў 2010 годзе. Экспазіцыя з творамі пераможцаў была прадстаўлена ў Беларусі, Украіне, Польшчы, Расіі. У канцы лютага 2011 года выйшаў альбом «Прэс-фота Беларусі 2010», у які ўвайшлі работы фіналістаў конкурсу.

Альбом «Прэс-фота Беларусі 2010» стаў, па словах арганізатараў, «пунктам адліку» для сучаснай беларускай фотажурналістыкі, прадставіўшы зрэз прафесійнага майстэрства фатографаў, якія супрацоўнічаюць з рознымі СМІ. У гэтых фатаграфіях — жыццё Беларусі, такое, якім яго штодня бачаць найлепшыя фотажурналісты краіны. Унікальным выданне робіць і той факт, што ўпершыню на старонках аднаго альбома сабраныя працы больш як 30-ці аўтараў.

Альбом «Прэс-фота Беларусі 2010» ужо можна набыць у кніжных крамах і на выставах у Мінску:

— кніжная крама «Логвінаў» і галерэя «Ў», (г. Мінск, пр. Незалежнасці, д. 37а)
— галерэя «Падземка» (г. Мінск, пр. Незалежнасці, д. 43)
— кніжны кірмаш у НВЦ «Белэкспа» (г. Мінск, вул. Я. Купалы, д. 27)

У найбліжэйшы час альбом з'явіцца і ў інтэрнэт-крамах prastora.by і knihi.by.

Арганізатары плануюць, што конкурс «Прэс-фота Беларусі» стане штогадовым. «Спадзяемся, што гэта паспрыяе фармаванню высокіх стандартаў у айчыннай фотажурналістыцы і абмену прафесійнай інфармацыяй і досведам паміж пакаленнямі беларускіх фатографаў», — сцвярджаюць яны.

Другі конкурс «Прэс-фота Беларусі» ўжо стартаваў 10 лютага. Да 10 сакавіка 2011 года ўдзельнікі могуць прадставіць на суд міжнароднага журы працы, створаныя ў перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2010 года.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на афіцыйным сайце конкурсу www.pressphoto.by.

**Паводле інфармацыі БАЖ**

КАМПАНІЯ

# СТРАХУ НЯМА

**3 сакавіка на мінскай сядзібе Руху «За Свабоду» адбылася прэзентацыя кампаніі салідарнасці «Страху няма».**

Мэта кампаніі «Страху няма» — разбурэнне атмасферы страху ў грамадстве, стварэнне настрою салідарнасці і адзінства.

Яна будзе праводзіцца сіламі ініцыятывы «Беларускі выбар» (Рух «За Свабоду», Партыя БНФ, Саюз «За мадэрнізацыю», Беларуская партыя «Зялёныя» і аргкамітэт па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу).

Прысутным журналістам і праваабаронцам прадэманстравалі відэаролік з Плошчы (у арыгінальнай якасці!), які цудам захаваўся пасля адбыцця арышту яго аўтара ў следчым ізалятары і атрымаў на YouTube больш за 25 тысяч праглядаў.

Таксама дэманстравалася слайд-шоў з фотаздымкаў акцыі пратэсту 19 снежня з архіву Руху «За Свабоду», якія яшчэ не публікаваліся.

Падчас імпрэзы сярод іншага прэзэнтавалі значкі салідарнасці «Я быў на Плошчы», якія раздаваліся ўдзельнікам.

**Паводле інфармацыі Руху «За Свабоду»**

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ДОБРААХВОТНАЯ ІЗАЛЯЦЫЯ АД ГРАМАДСТВА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**У той час, як у Беларусі судзяць палітвязняў, з пагрозай пазбаўлення волі на доўгія гады — то бок, ізаляцыі ад грамадства, — беларускія ўлады ізалююцца самі. Павольна, без ляманту і енку, яны робяць усё, каб іх не прымалі ў цывілізаваным свеце. Суды над палітвязнямі толькі пагаршаюць гэту сітуацыю.**

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі заявіў, напрыклад, што не бачыць сэнсу ў візіце ў Мінск кіраўніка рабочай групы Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Беларусі Уты Цапф. Пра адсутнасць такой неабходнасці ён заявіў Цапф падчас сустрэчы ў Вене, дзе 24–25 лютага праходзіла зімовая сесія ПА АБСЕ.

Рабочая група Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Беларусі планавала наведаць Мінск 27–29 сакавіка. Ліст пра магчымасць арганізацыі такога візіту кіраўнік рабочай групы Ута Цапф накіравала ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Асноўная мэта візіту — вывучэнне сітуацыі ў краіне пасля прэзідэнцкіх выбараў, што прайшлі ў снежні 2010 года. На сустрэчы з Цапф Гумінскі таксама заявіў, што не бачыць неабходнасці ў правядзенні ў Мінску сумесна з рабочай групай ПА АБСЕ семінара па пытаннях свабоды СМІ. «У такой абстаноўцы немэтазгодна праводзіць такі семінар, і лепш яго адкласці. Калі дзесяць нашых журналістаў унесены ў спіс неўязных, пра якую свабоду СМІ можна гаварыць?» — заявіў Гумінскі.

На месцы вышэйшага кіраўніцтва Гумінскага, трэба было б адвесці яго на канюшню і даць яму пару дзесяткаў розгаў. Першыя дзесяць — за адмову Цапф, другія дзесяць — за агучванне такой пазіцыі. Бо, як у свой час слушна заўважыў лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, Цапф у Беларусі і Цапф у Еўропе — дзве вялікія розніцы. І менавіта Ута Цапф з'яўлялася калі не ініцыятарам, дык адной з найважнейшых прыхільніц так званай «лібералізацыі» і дыялогу паміж Еўропай ды беларускімі ўладамі.

Цапф калісьці нават называлі «адвакатам беларускага рэжыму ў Еўропе». Адмовіцца ад адваката можа толькі… Скажам мякка, чалавек, які з галавою не сябруе.

Гэтая заява, дарэчы, была зроблена ў той час, калі 2–4 сакавіка ў Браціславе прайшла міжнародная канферэнцыя па бяспецы «Globsec–2011». Гэта канферэнцыя так званай «Вышаградскай чацвёркі» — Польшчы, Славакіі, Чэхіі і Венгрыі, да якой зараз далучылася і Германія. Галоўная тэма абмеркавання — сітуацыя ў Беларусі. Але ўдзел у ёй узялі апазіцыянеры-цяжкавагавікі: Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Казулін, Станіслаў Шушкевіч, Сяргей Калякін, Аляксей Янукевіч і іншыя. Пра ўдзел прадстаўнікоў афіцыйнай улады не паведамлялася.



Расія і так ужо на мяжы выбуху ў адносінах да беларускага кіраўніцтва. Яна ж пазіцыянуе сябе як моцная дзяржава, а беларускія ўлады псуюць гэты «імперскі», як сказалі б нацыяналісты, імідж

Нагадаем, на юбілейным саміце гэтага міждзяржаўнага аб'яднання 15 лютага была прынята адозва да беларускіх уладаў, у якой утрымліваецца заклік вызваліць палітзняволеных, спыніць пераслед незалежных сродкаў масавай інфармацыі і апазіцыі, стварыць умовы для правядзення дэмакратычных выбараў.

Адначасова цікавую лічбу агучылі часовы паверены ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан. «Паводле звестак амерыканскага ўрада, пасля ўвядзення санкцый у 2007 годзе беларускі экспарт на амерыканскі рынак знізіўся з амаль 1 мільярда 100 мільёнаў долараў да 175 мільёнаў долараў у 2010 годзе», — сказаў дыпламат.

«Вельмі важна звяртаць увагу не на тое, што будзем рабіць мы, а на тое, што адбываецца тут, у Беларусі», — падкрэсліў ён, гаворачы пра санкцыі. «Нашы дзеянні будуць рэакцыяй на падзеі тут, — заявіў Скэнлан. — ЗША працягваюць заклікаць да неадкладнага вызвалення ўсіх затрыманых і зняцця ўсіх абвінавачванняў супраць іх. Мы таксама заклікаем спыніць абуральны пераслед прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, незалежных СМІ, юрыстаў, палітычнай апазіцыі і членаў сем'яў затрыманых».

Звычайна аналітыкі кажуць, што такая пазіцыя Еўропы і ЗША падштурхне Беларусь у «братнія абдымкі» да Расіі, што санкцыі ўводзіць не варта, таму што мы можам страціць незалежнасць. У аналітыкаў з логікай усё ў парадку. Лагічна, што так яно і павінна было б адбывацца. Але не ўлічваецца тое, што беларуская структура ўлады зусім і цалкам законам логікі не паддаецца. І, нягледзячы на ўсе гэтыя санкцыі і папярэджанні, правадыры зусім не імкнуцца ў абдымкі Расіі.

Чарговым пацверджаннем гэтага стала заява яшчэ адной парламентаркі — кіраўніцы камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Ніны Мазай. Рашэнне беларускага парламента па пытанні прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі «калісьці будзе», заявіла яна. «Такія складаныя пытанні не вырашаюцца ў адзін дзень», — падкрэсліла Мазай.

Цікава толькі, навошта яна закранула гэтую тэму. Здаецца, нават Расія, якая раней была зацікаўленая ў такім прызнанні, сёння цалкам змоўкла наконт гэтай тэмы. Можа, лепей было б не дражніць нашага ўсходняга мядзведзя? Асабліва, калі акрамя як ад яго, паратунку беларускай уладзе чакаць няма адкуль?

Тым больш, Расія і так ужо на мяжы выбуху ў адносінах да беларускага кіраўніцтва. Яна ж пазіцыянуе сябе як моцная дзяржава, а беларускія ўлады псуюць гэты «імперскі», як сказалі б нацыяналісты, імідж. 1 сакавіка з новай заявай па справе арыштаваных у Беларусі расійскіх грамадзян Арцёма Брэуса і Івана Гапонава выступіла Міністэрства замежных спраў Расіі.

«Пасля таго, як на папярэднім пасяджэнні абвінавачанне ў адрас Брэуса і Гапонава рассыпалася літаральна на вачах, усе разлічвалі, што будзе прынята рашэнне пра спыненне іх судовага пераследу. Аднак атрымалася інакш, паколькі само абвінавачанне засталося ранейшым, але да справы была прыцягнута вялікая група новых сведак з ліку супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Такі паварот падзей не можа не насцярожваць», — гаворыцца ў заяве расійскага знешнепалітычнага ведамства.

Як заявіў саветнік пасольства Расіі ў Беларусі Вадзім Гусеў, «вакол судовага працэсу шмат пытанняў, у прыватнасці, дзе былі тыя 15 сведак-пацярпелых, пра якіх толькі сёння загаварыла абвінавачанне».

Так што ў беларускага кіраўніцтва засталося толькі адно: спыніцца, згарнуць вакол сябе прастору і спыніць час. Як яно гэта здолее зрабіць без магічных сродкаў, убачыць цяжка.

ФІГУРЫ ТЫДНЯ

## УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ



Лаўрэатам літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес» за 2010 год стаў Уладзімір Някляеў. Прэміяй адзначана кніга «Кон. Вершы двух стагоддзяў», якая пабачыла свет у мінскім выдавецтве «Лімарыюс».

«За 2010 год у шорт-ліст прэміі патрапілі кнігі Міхася Андрасюка «Вуліца Добрай Надзеі», Леаніда Галубовіча «Сыс і калуары», раман Юрыя Станкевіча «П'яўка», зборнік вершаў Андрэя Хадановіча «Несіметрычныя сны» і зборнік вершаў Уладзіміра Някляева «Кон». Пасля з'яўлення шорт-ліста адбываюцца кансультацыі і апытанні экспертаў. На гэты раз, практычна ўпершыню, лаўрэат быў вызначаны без якіхсьці ваганняў — бо ўсе ў адзін голас казалі, што лаўрэатам мусіць быць Уладзімір Някляеў», — цытуе «Радыё Рацыя» старшыню аргкамітэта літаратурнай прэміі Алеся Аркуша.

У 1996 годзе прэмію прысудзілі Славаміру Адамовічу, арыштаванаму за верш «Убей президента». Някляеў атрымае прэмію, калі будзе вызвалены з-пад хатняга арышту.

Літаратурная прэмія «Гліняны Вялес» заснавана ў 1993 годзе сябрамі Таварыства Вольных Літаратараў. Лаўрэат атрымлівае сімвалічную ўзнагароду — гліняны стод апекуна мастацтва. Грашовага складніка ў прэміі няма.

## СЯРГЕЙ КЛІМАЎ



Новы дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» Сяргей Клімаў прызнаецца, што прыехаў у Нясвіж як менеджар і не мае мэты вывучыць генеалогію Радзівілаў і гісторыю Нясвіжскага замка.

«З тэмай Радзівілаў я сутыкаўся толькі ўскосна раней. Але тут патрэбен менеджар у гэтым праекце, вельмі вялікім і вельмі запушчаным, — расказвае Клімаў у інтэрв'ю газеце «Звязда». — Маса супярэчнасцяў, вельмі шмат канфліктаў. Пэўна, слабы быў прафесійны ўзровень музейшчыкаў, якія пачалі гэта рабіць. Нягледзячы на тое, што былі масіцтыя кансультанты, але на месцы працуюць звычайныя супрацоўнікі. Тут вельмі вялікая праблема ў тым, што запаведнік будзе выдатна выглядаць, але падрыхтоўка кадраў... У Беларусі няма школы музейшчыкаў. Можа, яна ёсць у Мінску або вялікіх гарадах, але на перыферыі няма. Ёсць пэўныя самародкі, якія любяць гэта — але тое ўзровень краязнаўства. Музеязнаўства — гэта даволі складаная рэч».

Клімаў расказаў, што яго заробак як дырэктара музея складае 2,5 мільёны рублёў, што працоўны кабінет ён плануе зрабіць у Нясвіжскім замку: «Прыязджаюць вельмі высокія госці, дзе іх прымаць? Па-другое, замак вельмі складаны тэхнічна для кіравання. Трэба там увесь час знаходзіцца і пільнаваць гэта. А зараз такое дачыненне: не прыехалі турысты — ну і дзякуй Богу, няма туалетнай паперы — ну і нафіг трэба».

У ліпені замак мусіць адчыніцца для наведвальнікаў. Па словах дырэктара музея, яны пабачаць інтэр'ерныя залы, набытую старую нацыянальную мэблю XVIII стагоддзя, батлейку, звярынец, Чорную Панну.

## ЯЎГЕН ГУТАРОВІЧ



Беларускі спрынтар Яўген Гутаровіч з французскай каманды Francaise Des Jeux заняў другое месца ў аднадзённай велагонцы Куурнэ — Брусэль — Куурнэ працягласцю 193 кіламетры. Пераможцам у фінішным спрынце стаў 26-гадовы аўстралійскі гоншчык Крыс Сатан з велагрупы «Скай». Крыс Сатан стаў першым аўстралійцам, які выйграў гэтую прэстыжную аднадзёнку.

За спінамі Крыса Сатана і Яўгена Гутаровіча засталіся такія прызнаныя спрынтэры, як немец Андрэ Грайпель, амерыканец Тайлер Фарар, нарвежац Эвальд Боасэн-Хаген і іншыя. Яшчэ адзін беларускі гоншчык Аляксандр Кучынскі з расійскай «Кацюшы» фінішаваў у асноўнай групе і заняў 72-е месца.

Уражэнец Мінска Яўген Гутаровіч двойчы станавіўся чэмпіёнам Беларусі па веласпорце на шашы ў групавой гонцы.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ВОСЕМ ЗМОВАЎ І АДНА РЭСПУБЛІКА

Сяргей НІКАЛЮК

**Большасці беларусаў усё яшчэ складана ўявіць лад, які абапіраўся б на закон, а не на рэпрэсіі.**



За два месяцы, што прайшлі пасля заканчэння прэзідэнцкіх выбараў, думка пра змову ў галаве «адзінага палітыка» (АП) так і не рассмакталася. Прывяду адно з яго апошніх выказванняў: *«События 19 декабря лишний раз подтвердили, что против нашей страны был организован настоящий заговор. Спонсировали его иностранные спецслужбы, а роль черновых исполнителей отводилась местным политическим «вождям».*

Такім чынам, мы маем адну змову, прычым сапраўдную, і дастаткова шматлікі калектыў чарнавых выканаўцаў у выглядзе мясцовых палітычных «правадыроў». Галоўнай асаблівасцю апошніх (а гэта ні для каго не сакрэт) з'яўляецца іх поўная няздольнасць дамаўляцца паміж сабой. Адсюль напрошваецца высnова: калі змова мела месца, то не адна, іх было не менш за восем. Хто лічыць маю выснову нелагічнай, хай кіне ў мяне каменем ці хоць бы агучыць аргументаваную рэпліку.

## Свет праз прызму рэпрэсій

Жыццё поўнае парадоксаў. З аднаго боку, беларусы славяцца сваёй талерантнасцю, з другога — колькасцю зняволеных на 100 тысяч насельніцтва. Паводле гэтага паказчыка яны займаюць другое месца ў Еўропе пасля Расіі і трэцяе — у свеце. Мне могуць запярэчыць, што справа тут не ў беларусах (не ў народзе), а ва ўладзе. Згодзен, не самі ж людзі прыгаворваюць сябе да працяглых тэрмінаў зняволення. Для гэтага існуюць адмыслова выбраныя ўладай прафесіяналы — суддзі. Аднак адбіраюцца яны з народа, і таму ў культурным плане ад народа нічым прынцыпова не адрозніваюцца.

Апытанні НІСЭПД дазваляюць нам зірнуць на беларускую культуру пад нечаканым ракурсам. У чэрвені 2009 года сацыёлагі выразна высветліць, што прымушае беларусаў выконваць законы. У лідарах апынуўся «страх пакарання». Яго адзначылі больш за палову апытаных — 52%, яшчэ 20% растлумачылі законапаслухмянасць суайчыннікаў звычкай, і толькі 16% — правільнасцю законаў. А вось як падзяліліся адказы на пытанне «Якіх наступстваў, на Вашу думку, можа быць больш — станоўчых ці адмоўных — ад змякчэння пакарання за малаважныя крымінальныя злачынствы?»: адмоўных — 53%, станоўчых — 29%. Такая «сацыялогія» мае патрэбу ў тлумачэнні.

Прымусіць чалавека падпарадкоўвацца можна заахвочваннем (ідэальным ці матэрыяльным) і пакараннем. Гэтыя спосабы ўніверсальныя, і мы без цяжкасці адшукаем іх у любой культуры. У гэтым сэнсе адна культура ад другой адрозніваецца суадносінамі пералічаных элементаў. Але і ў межах асобна ўзятай культуры гэтыя суадносіны не з'яўляюцца раз і назаўжды дадзенымі, што дазваляе нам разглядаць гістарычны працэс як рух са свету рэпрэсій у свет узнагарод. Зразумела, што ўлада асобна ад грамадства здзейсніць гэты пастулапальны рух не ў стане.

У рамках Саюзнай дзяржавы прынята гаварыць пра беларусаў і рускіх як пра дзве галіны аднаго народа (у снежні 2009 года з гэтым пагадзіліся 67% беларусаў). У гэтай сувязі будзе цікава ацаніць рэпрэсіўны складнік рускай культуры. На думку вядомага расійскага культуролага Ігара Якавенкі: «У рускай культуры функцыі рэпрэсіі носяць універсальны характар. Яна фармуе ўнутраны свет чалавека, дае яму мадэлі разумення свету — як зямнога, так і нябеснага. Рэпрэсія дазваляе арыентавацца ў сацыяльным космасе, задае нормы і каштоўнасці, забяспечвае барацьбу з хаосам. Яна ўваходзіць як істотны момант у сямейныя адносіны, пранізвае сабой выхаванне, адукацыю, афармляе адносіны да сакральных сутнасцяў».

У якой ступені ўсё пералічанае вышэй уласціва беларускай культуры? Пытанне няпростае. Але з апытанняў НІСЭПД вынікае, што каля паловы беларусаў бачаць свет праз прызму рэпрэсій.

## «Давай, Сашок, давай!»

Знаёмства з элементамі культуралагічнай азбукі дазваляе нам зразумець яшчэ адзін парадокс. Сталін расстрэльваў і зняволіваў, Хрушчоў вызваляў. Але калі першы і сёння ўспрымаецца шматлікімі асобамі найначай як «бацька народаў», то другога, калі і ўзгадваюць, то пераважна ў сувязі з яго анекдатычнай сімпатыяй да царыцы палёў кукурузы.

На думку людзей заходняй (цэнтраванай на заахвочванні) культуры, каб стаць законным (легітымным) прэзідэнтам, неабходна займець на выбарах падтрымку большасці. На думку ж прадстаўнікоў культуры рэпрэсіўнай, колькасць галасоў тут не пры чым. Улада, як адзначае Якавенка, «стварaецца, пазнаецца і перажываецца ў акце *справядлівай рэпрэсіі»*. У гэтым сэнсе Хрушчоў дазваляў сабе занадта шмат чалавечага, руйнуючы тым самым вобраз трансцэндэнтнага ўсходняга ўладара. Не цягнуў на такога ўладара і Гарбачоў з яго *«новым мЫшлением»*, замешаным на агульначалавечых каштоўнасцях.




Справядлівыя рэпрэсіі ў народным уяўленні — гэта ў першую чаргу рэпрэсіі, скіраваныя ўладаром супраць свайго бліжэйшага асяроддзя (баяраў). У гэтай сувязі я ўзгадваю свайго памерлага цесця, які, радасна паціраючы рукі, прамаўляў у 1994 годзе: *«Давай, Сашок, давай!»* Наіўная душа, ён чакаў паказальных судовых працэсаў. Ён верыў, што ўсенародна абраны не толькі верне яму абясцэненыя зберажэнні, але і пакарае тых, хто іх у яго выкраў.

Паказальных судоў над карупцыянерамі я штосьці не ўзгадаю. Але канца гісторыі не наступіла. Месца, першапачаткова прызначанае для карупцыянераў, занялі «нацыянал-экстрэмісты», яны ж «нацыянал-патрыёты». Паступова іх выцеснілі прадстаўнікі «так званай апазіцыі». Мой цесць падмены не заўважыў, ды яму гэта было і ўсё роўна. Галоўнае, што застаўся вораг, і застаўся той, хто працягваў яго караць. Сёння спіс ворагаў папоўнілі «замежныя спецслужбы». Жыццё працягваецца! Свет для такіх, як мой цесць, па-ранейшаму поўны сэнсу, і гэты сэнс яму надае Улада, здольная сілай душыць сваіх ворагаў.

У мяне няма звестак, які працэнт беларусаў ухваліў/асудзіў жорсткі разгон дэманстрантаў на плошчы Незалежнасці 19 снежня. Спадзяюся, сацыёлагі НІСЭПД адпаведныя пытанні ўключаць у чарговую анкету. Што тычыцца адносін да самой акцыі пратэсту, то ў снежні яе ўхвалілі толькі 17% рэспандэнтаў, у той час як процілеглы пункт гледжання выказалі ўжо знаёмыя нам 52% апытаных, паставіліся да яе абыякава — 24%.

## Стымулам па галаве

На лістападаўскім рэферэндуме 1996 года 80% жыхароў краіны, дзяржаўны гімн якой пачынаецца словамі: «Мы, беларусы, — мірныя людзі», не падтрымалі прапанову па адмене смяротнага пакарання. На IV Усебеларускім народным сходзе АП нагадаў пра гэты факт: *«У нас состоялся референдум, более 80 процентов населения высказалось за сохранение этой чрезвычайной меры, и я не могу пойти против всего народа. Мы делаем замер в обществе: количество людей, которые требуют оставить смертную казнь, не уменьшается. Как я могу пойти против народа?!»*

Улічваючы, што праводзіў рэферэндум 1996 года ЦВК пад кіраўніцтвам Віктара Ганчара, а падпісвала выніковы пратакол у пасадзе в.а. старшыні камісіі Лідзія Ярмошына, прапаную паставіцца да афіцыйнага выніку ўсенароднага волевыяўлення з поўнай доляй скептыцызму. Аднак і па апытаннях НІСЭПД прыхільнікі смяротнага пакарання складаюць у Беларусі хай і адносную, але большасць: супраць адмены — 48%, за адмену — 42% (кастрычнік 2010 года).

Нагадаю, стаўленне да смяротнага пакарання ў ХХІ стагоддзі з'яўляецца своеасаблівым тэстам на прыналежнасць да цывілізаванага свету, і здаць гэты тэст беларусы пакуль не ў стане. Самае цікавае, што сярод прыхільнікаў уступлення Беларусі ў ЕС доля тых, хто падтрымлівае захаванне смяротнага пакарання, большая, чым сярод прыхільнікаў аб'яднання рэспублікі-партызанкі з Расіяй (51% vs. 47%)! Прызнаюся, я не ў стане зразумела растлумачыць, чаму па-еўрапейску арыентаваныя беларусы адрозніваюцца павышанай агрэсіўнасцю.

Культуролагі вылучаюць уладную і нізавую рэпрэсіі. Паміж імі існуе дыялектычная сувязь. У момант распаду дзяржаўнасці, калі ўлада, па словах АП, *«валяется в грязи»* і ўжо ў сілу гэтага няздольная выконваць рэпрэсіўную функцыю ў поўным аб'ёме, пачынаецца разгул крыміналу. Вазьму на сябе смеласць сцвярджаць, што ў рамках рэпрэсіўных культур дзейнічае закон захавання рэпрэсій, гэтакі своеасаблівы аналаг законаў захавання масы і энергіі.

Рух рэпрэсіўнага цэнтру цяжару з верхніх узроўняў сацыяльнай іерархіі на ніжнія дэфармуе звыклыя маральныя нормы і каштоўнасці, дыскрэдытуе стымулы, якія падахвочваюць да працы. Праілюструю сказанае дадзенымі НІСЭПД. У «ліхія 1990-я» напярэдадні першых прэзідэнцкіх выбараў (снежань 1993 года) рэйтынг фактараў, што вядуць да ўзбагачэння, на думку беларусаў, выглядаў наступным чынам: асабістыя сувязі — 72%, несумленнасць — 56%, праца — 37%, адукацыя — 22%. У студзені 2007 года ва ўмовах сацыяльна-эканамічнай стабільнасці на першае месца выйшла праца — 68%, істотна пацясніўшы пры гэтым асабістыя сувязі — 43%. Да іх ушчыльную наблізілася адукацыя — 38%, а несумленнасць апусцілася на самае дно — 16%.

Сусветны крызіс не змяніў сістэму каштоўнасных прыярытэтаў беларусаў, што ўскосна сведчыць пра захаванне за Уладай манапольнага права на гвалт.

Гвалт — універсальны рэгулятар канфліктаў у традыцыйных грамадствах. Носьбіты традыцыйнага светапогляду, сутыкнуўшыся з праблемай, адразу ж фармулююць два класічныя пытанні: «Хто вінаваты?» і «Што рабіць?». Пасля таго, як адказ на першае пытанне знойдзены, пошук адказу на другое пытанне цяжкасцей не выклікае, бо дзеянні пачынаюць развівацца ў рамках звыклага алгарытму: спыніць, стукнуць, збіць на горкі яблык. Можна даць палкай па галаве. Ёсць і такі варыянт.

Дадзены алгарытм дзеянняў досыць эфектыўны пры арганізацыі простых форм працы. Паны стагоддзямі лупцавалі прыгонных, і рэнтабельнасць сельскагаспадарчай вытворчасці ад гэтага толькі павялічвалася. Але я сумняваюся, што замена розгі палкай дазволіць *«придать белорусской экономике новый облик, модернизируя ее структуру, а также промышленность и сельское хозяйство на основе самых передовых производств и технологий, создавая стимулы для отечественных и иностранных инвестиций»*.

Дарэчы, пра стымулы. Адкрыем у чарговы раз слоўнік: лацінскае «stimulus» — вострая палка, якой паганялі быдла.

КАМПАНІЯ

# НАРОДНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

Вольга ХВОІН

**Кампанія «Гавары праўду!» гадавіну сваёй дзейнасці адзначыла ікрой баклажаннай (хаця старт кампаніі год таму адзначаўся ікрой сапраўднай), бо «якія часы, такая і ікра». Актывісты кампаніі распачынаюць новую акцыю «Народная салідарнасць».**

Па справе аб масавых беспарадках у якасці абвінавачваных праходзіць лідар кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў. Цяпер ён знаходзіцца пад хатнім арыштам. Актывіст кампаніі Васіль Парфянкоў ужо асуджаны на 4 гады калоніі строгага рэжыму. Аляксандр Фядута і Павел Вінаградаў — у СІЗА КДБ, Андрэй Дзміртыеў і Сяргей Вазняк былі вызваленыя з-пад варты пад падпіску аб нявыездзе.

Адзначаючы гадавіну сваёй дзейнасці, грамадзянская кампанія «Гавары праўду!» абвясціла пра пачатак новай акцыі — «Народная салідарнасць». У 24 гарадах Беларусі будуць пададзеныя заяўкі на пікеты салідарнасці з палітвязнямі. Пікеты плануецца правесці 19-га і на Дзень волі — 25 сакавіка.

Палітолаг Святлана Навумава расказала, што ў базе дадзеных кампаніі подпісы паўмільёна беларусаў. Цяпер актывісты «Гавары праўду» плануюць абыйсці ўсіх гэтых людзей, каб далучыць іх да вырашэння агульнанацыянальных, найперш сацыяльных праблем. «Самай галоўнай, цэнтральнай ідэяй кампаніі, тое, з чаго яна пачыналася, была актывізацыя беларускага грамадства дзеля рашэння яго праблем уласнымі сіламі. А праблем, як высветлілася, было нямала. Толькі з сакавіка па верасень 2010 года мы правялі больш за 80 кампаній у 33 гарадах Беларусі. Было дзве агульнанацыянальныя кампаніі: за наданне адной з вуліц Мінска назвы імя Васіля Быкава і за вылучэнне Уладзіміра Някляева на Усебеларускі народны сход. У нас сёння ёсць база людзей, якія так ці інакш падпісваліся за нашу кампанію. Гэта паўмільёна чалавек, пяцьсот тысяч людзей, якія ставілі свой подпіс, не баючыся назваць сваё імя, прозвішча, адрас. Я не кажу, што яны ставілі свой подпіс за Някляева і толькі. Яны падпісваліся за тое, каб быць гаспадарамі свайго лёсу», — зазначыла Навумава.

Разам з тым былы кіраўнік перадвыбарчага штаба Някляева Андрэй Дзмітрыеў заявіў, што «Гавары праўду!» не будзе праводзіць ніякіх акцый салідарнасці пад вокнамі кватэры Някляева.


Фота Вольгі Хвоін

Злева направа: Андрэй Дзмітрыеў, Святлана Навумава, Сяргей Вазняк

«Я ведаю Някляева, ведаю як чалавека. І ведаю, што калі мы зробім акцыю, то ён падыдзе да вакна, што забаронена. Гэта можа быць падставай, каб вярнуць яго ў СІЗА КДБ. І я кажу, што хай ён лепш будзе няздольным падыйсці да вакна ў сябе ў хаце. Чым будзе мець такую магчымасць у турме. Мы гэтае рашэнне прынялі кансалідавана ўсёй камандай, што мы не будзем правакаваць улады і яго на такія дзеянні», — падкрэсліў Дзмітрыеў.

Натуральна, кожны вольны самастойна абіраць лінію сваіх паводзінаў, але выглядае на тое, што такімі заявамі пацвярджаецца згода гуляць у няпростыя гульні ўладаў па іх правілах. Зрэшты, як і адмова расказваць пра ўмовы ўтрымання ў СІЗА КДБ, пра тое, чаму насамрэч была зробленая скандальная заява Дзмітрыева па беларускаму тэлебачанню. Журналіст Сяргей Вазняк заявіў, што да яго фізічныя метады ўздзеяння не прымяняліся. «Тут важнае пытанне, што такое катаванне. Мяне, напрыклад, не білі, на «ластаўку» ніколі не ставілі. Але ці з'яўляецца катаваннем, што цягам месяца не атрымліваеш лісты і твае лісты не даходзяць? Ці з'яўляецца катаваннем тое, што паводле заканадаўства чалавек можа звяртацца па дапамогу да адваката, а адваката па некалькі месяцаў не дапускаюць і не робяць следчых дзеянняў? Ці з'яўляецца катаваннем, што ў камеры няма туалета? Ці калі адбываецца вобшук, які называюць «шмонам», чалавека распранаюць і прымушаюць голым прысядаць? Само знаходжанне ў следчым ізалятары — вельмі цяжкае псіхалагічнае выпрабаванне», — прызнаў Сяргей Вазняк.

Разам з тым цікавая яго рыторыка ў звароце да кіраўніцтва Беларусі. «Да сваіх апанентаў трэба ставіцца як да палітыкаў, а не да крымінальнікаў, — заявіў Сяргей Вазняк. — Уладам трэба перагарнуць старонку 19 снежня. І ёсць магчымасць перагарнуць гэтую старонку хораша». То бок калі б пераслед апанентаў Лукашэнкі быў бы прыпынены, гэта б скасавала віну ўладаў за тое, што людзі месяцамі сядзелі ў турме за свае палітычныя перакананні?

Андрэй Дзмітрыеў ухіліўся ад каментараў наконт таго, як з ім абыходзіліся супрацоўнікі спецслужбаў. «Мы заклікаем людзей быць салідарнымі, гаворым усю праўду да канца. Можна быць салідарнымі з тымі, хто сядзіць у КДБ, але для гэтага не трэба пагаршаць іх умовы знаходжання там», — перакананы паплечнік Някляева.

Цікава, што жонка Аляксандра Фядуты, які знаходзіцца ў СІЗА КДБ, Марына Фядута мяркуе, што баяцца ўжо няма чаго і варта было б зрабіць такія факты публічнымі: «Канешне, вырашаў бы Аляксандр, ён сам прымае ўсе рашэнні. Мне цяжка сказаць, наколькі гэта пашкодзіць тым, хто знаходзіцца ў СІЗА КДБ. Але грамадскасць мусіць ведаць усё. Мне падаецца, што гэта мусіць турбаваць і турбаваць нас».

МЕРКАВАННЕ

# КРЫЗІС — НЕ ЗАЎЖДЫ КЕПСКА

**Мэнэджар праграмы «Міжнароднае права ў праваабарончай дзейнасці» Фонду Дамоў правоў чалавека Людміла Ульяшына жыве і працуе ў Нарвегіі. У 1990-я яна з'ехала з мужам-навукоўцам з Беларусі, але краіна не стала для яе чужой і далёкай. Людміла супрацоўнічае з праваабаронцамі, журналістамі, адсочвае падзеі ў Беларусі. «Заклікаць людзей «не бойцеся!» з майго боку было б не зусім справядліва, — заўважыла Людміла ў размове з журналістам «НЧ» Вольгай Хвоін. — Але ёсць стойкае адчуванне калапсу ў грамадстве. І дзе выхад, я не ведаю».**

***— Ці трэба ў адказ на ўдар падстаўляць другую шчаку, або ў гвалтоўным супраціве ўсё ж ёсць сэнс?***

— Гэта філасофскае пытанне, якое мае мноства аспектаў. Зразумела, не ўсякі гвалт магчыма пераадолець мірным шляхам. Ва ўмовах тыраніі народ мае права на адкрыты пратэст, і кожны тыран гэта мусіць разумець. Але, калі заходзіць размова аб развіцці грамадства, я думаю, што гэта мусіць быць эвалюцыя, а не рэвалюцыя. Пасля развалу Савецкага саюза не маглі быць хутка створаныя новыя дэмакратычныя інстытуты. Адпаведна, працавалі ці па старой мадэлі, ці пераблыталі дэмакратыю з усёдазволенасцю. І хваля пратэстаў у Грузіі, Кыргызстане, ва Украіне, калі людзі стаміліся ад адсутнасці кіравання, выходзілі на вуліцы са спадзевам, што яно назаўтра адновіцца, мела прававал. У Беларусі наадварот: ёсць кіраванне, але абсалютна няма дэмакратыі.


Фота Вольгі Хвоін

Людміла Ульяшына

***— Як вы ацэньваеце ўзровень праваабарончага руху ў Беларусі?***

— Аб праваабаронцах я даведалася, калі працавала адвакатам. Тады іх прадстаўлялі як напаўпісьменных людзей, якія зараблялі грошы на цёмных кліентах, не плацілі падаткі і шкодзілі як насельніцтву, так і дзяржаве. Прайшло шмат часу, перш чым я даведалася, што статус праваабаронцы можа мець кожны, хто ведае міжнародныя прававыя інструменты і ўніверсальныя стандарты ў галіне правоў чалавека, мае права прасоўваць гэтыя стандарты і ажыццяўляць абарону правоў іншых людзей, у тым ліку праз суд. Насамрэч, аказанне юрыдычных паслуг на прафесійнай аснове патрабуе ліцэнзавання. Калі праваабаронца ўваходзіць у прафесійную дзейнасць адваката, то трэба размяжоўваць паняткі асабістых правоў і не перасякацца з прыватнымі інтарэсамі людзей, бо гэта якраз поле дзейнасці адвакатаў. На мой погляд, у Беларусі сфармавалася сур'ёзная праваабарончая сетка людзей, якія не парушаюць нацыянальнае заканадаўства, але іх дзейнасць назалае ўладам. Праваабарончы рух Беларусі больш прафесійны і аб'яднаны, чым у многіх іншых краінах. Да ўсяго, праваабаронцы навучыліся ўзгадняць сваю дзейнасць з адвакацкай, і на такім узроўні ёсць добрае поле для супрацоўніцтва гэтых супольнасцяў.

***— У Нарвегіі шараговы грамадзянін разбіраецца, як працуюць міжнародныя інструменты абароны правоў чалавека?***

— Як правіла, людзі ўсё ж мала цікавяцца сваімі грамадзянскімі правамі, тым больш у краіне, дзе з гэтымі правамі няма праблем. Савет Еўропы цяпер уводзіць праграму па вывучэнні правоў чалавека, пачынаючы з дашкольнага ўзросту. Думаю, нарвежскаму грамадству, як і беларускаму, у гэтым рэчышчы трэба многае зрабіць. У Нарвегіі ёсць праблемы ў тых, хто просіць прытулак. Часам працэдуры ігнаруюцца і разгляд справы адмыслова прызначаецца на канікулы, калі адвакатаў няма на месцы, пасля чаго можна хутка выслаць чалавека. Часам, нягледзячы на тое, што яму там пагражаюць катаванні, а гэта з'яўляецца неаспрэчнай падставай для таго, каб пакінуць чалавека ў краіне. Такая сітуацыя часта здараецца з бежанцамі з Чачні.

**20.35** Фільм «Экстрэмальнае спатканне». ЗША, 2004 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Па-за дасяжнасцю». ЗША - Польшча, 2004 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.30** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.00** Жывы гук.
**11.15** Кінаспробы.
**11.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**12.35** Серыял «Сіла прыцягнення».
**13.30** Мультфільм.
**13.45** Пазакласная гадзіна.
**14.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**14.55** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Меладрама «Маці і мачаха» (СССР).
**20.40** «Калыханка».
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.50** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.00** «Пра мастацтва».
**23.25** Дыялогі аб рыбалцы.
**23.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**00.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Падарунак лёсу».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «З новым домам!». Ток-шоў.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Падарунак лёсу».
**22.20** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** Фільм «Афіцэры».

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**12.05** «Да суду».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** Прэм'ера. «Надзея на каханне».
**00.05** Фільм «Нячысцік».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 4-ы этап.
**10.00** Вось дык так!!!
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Чэхіі (Шпіндлераў Млін). Жанчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету ў Германіі (Інцэль). Дзень 1-ы.
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Нарвегіі (Квітфьель). Мужчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**13.45** Лыжнае двааборства. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Чэхіі (Шпіндлераў Млін). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі. Мужчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжнае двааборства. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**17.00** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 5-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.15** Веласпорт. Велагонка Тырэна-Адрыятыка (Італія). 3-і этап.
**19.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Эстафета.
**21.00** Цімберспорт. Серыя Тура чэмпіёнаў. Прамая трансляцыя.
**22.30, 23.00** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір Giants Live (Стамбул, Турцыя).
**23.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Эстафета.
**01.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit. Часопіс.
**01.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130. Кваліфікацыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** «Пупенда», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**09.25** Праект «Будучыня».
**09.50** «Школа на санцапёку», серыял.
**10.15** Форум: «Еўрапейскія арэлі».
**11.00, 15.40** Рэпартэр.
**11.25, 16.15** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 1.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**14.00** Праект «Будучыня».
**14.25** «Школа на санцапёку», серыял.
**14.50** Форум: «Еўрапейскія арэлі».
**16.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 2 серыя.
**17.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**18.20** Форум: «Еўрапейскія арэлі».
**19.05** Без рэтушы: «Песня на два галасы», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.25** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
**22.10** «Пітбуль», серыял: 2 серыя.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.05** Аб'ектыў.
**23.30** Гарачы каментар.

## 12 САКАВІКА, СУБОТА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25** Дзелавое жыццё.
**08.30** Існасць.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** Школа доктара Камароўскага. Ток-шоў (Украіна).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Трагікамедыя «Сабачае сэрца» (СССР). 1-я серыя.
**13.45** Дак. фільм «Невядомая версія».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Nota Bene.
**16.50** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Добруш. Горад мастоў» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Канцэрт лаўрэатаў прэміі «Залаты грамафон» (Расія). Частка 2-я.
**21.00** Панарама.
**21.40** Авантурная меладрама «Добрая жанчына» (ЗША- Вялікабрытанія-Італія).
**23.25** Містычная меладрама «Змярканне» (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.

### Н

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** Прэм'ера «Вялікі пост».
**12.20** «Разумніцы і разумнікі».
**13.10** «Хвіліна славы».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Камедыя «Паглядзі, хто гаворыць».
**18.00** «Адзін супраць усіх».
**19.00** АНТ прадстаўляе: «Я спяваю».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.20** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.00** Прэм'ера. Фільм «Мінесота».

### СТВ

**06.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.50** «Мінщына».
**08.45** Фільм «Экстрэмальнае спатканне».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТВ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** Фільм «Добрыя». СССР, 1979 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Пад знакам Панны». Украіна, 2008 г.
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Яе звалі Нікіта». Францыя - Італія, 1990 г.
**23.50** Фільм «Зло». Данія - Швецыя , 2003 г.
**01.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.40** Нашы тэсты.
**08.10** Усё аб бяспецы.
**08.35** Рэальны свет.
**09.10** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.40** Жансавет.
**10.20** Дача здароўя.
**11.05** Тэлебарометр.
**11.10** «Ты і Я - 2». Забаўляльнае ток-шоў.
**12.10** «Запал па культуры».
**12.55** Лабірынты: каханне ў жыцці і творчасці Максіма Багдановіча. Частка 2-я.
**13.25** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Гонка з масавым стартам. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.15** Дакументальна-пазнавальны фільм «Калі скончыцца нафта» (Францыя).
**15.25** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Гонка з масавым стартам. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.15** Мультфільм.
**16.30** Тэлебарометр.
**16.35** Халі-галі. Скетч-шоў.
**16.55** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Паўфінал канферэнцыі «Захад». Матч 3-і. Прамая трансляцыя.
**19.20** Конкурс-вікторына «Дзеці новага пакалення».
**20.15** Бенефіс. Гумарыстычная праграма. Частка 1-я.
**21.20** Камедыя «Рэальнае каханне-2».
**23.05** Жывы гук.
**23.50** Канцэрт Stevie Wonder. «Soul Life & Live At Last» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Мая планета».
**07.40** Фільм «Падарожжа будзе прыемным».
**09.10** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Афіцэры».
**13.40** «Пакой смеху».
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Улада факту». Дак. фільм.
**15.40** «Уцёкі ад смерці. Маргарыта Валодзіна». Дакументальны фільм.
**16.40** «Мой срэбны шар».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** «Песні кіно». Творчы вечар.
**23.10** Фільм «Калі б я цябе кахаў...». 2010 г.
**01.05** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.30** «Агляд».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Прэм'ера. Камедыя «Зануда».
**16.20** «Апошняе слова».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руская сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.20** Прэм'ера. Крымінальны трылер «Законапаслухмяны грамадзянін».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit. Часопіс.
**10.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Эстафета.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Чэхіі (Шпіндлераў Млін). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Лыжнае двааборства. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130. Прамая трансляцыя.
**12.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**13.15** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**15.15** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**16.15** Лыжнае двааборства. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**17.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі. HS 130. Прамая трансляцыя.
**18.45** Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету ў Германіі (Інцэль). Дзень 3-і.
**20.00** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 6-ы этап.
**21.00** Веласпорт. Велагонка Тырэна-Адрыятыка (Італія). 4-ы этап.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**01.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Мас-старт.
**02.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Мас-старт.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.25** На колах.
**08.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**08.45** «Таямніца Сагалі», серыял: 2 серыя.
**09.10** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45** Басаножна свеце.
**10.10** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**10.30** Эксперт.
**10.55** Маю права (прававаяпраграма).
**11.15** Госць «Белсату».
**11.35** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 2.
**12.05** Асабісты капітал.
**12.55** «Таямніца Сагалі», серыял: 2 серыя.
**13.20** Калыханка для самых маленькіх.
**13.50** Форум: «Еўрапейскія арэлі».
**14.35** Без рэтушы: «Песня на два галасы», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**15.00, 19.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**15.10** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь: ч. 2.
**15.40** Рэпартэр.
**15.05** «Ранча», серыял: 39 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**17.55** «Супраць забыцця. След дыктатараў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.20** Вагон.
**20.30** «Расія. XX стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 2.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.45** «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША.
**23.05** «Два-тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**00.10** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**00.35** Навігатар.
**00.45** Аб'ектыў.

## 13 САКАВІКА, НАДЗЕЛЯ

### Першы канал (1)

08.05 Мультфільмы.
08.45 «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
09.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
09.10 «Арсенал».
09.40 У свеце матораў.
10.15 «Культурныя людзі».
10.50 Камедыйны серыял «Сваты-3».
12.15 Трагікамедыя «Сабачае сэрца» (СССР). 2-я серыя.
13.45 «Сінематэка».
14.35 Зямельнае пытанне.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.35 Відэафільм АТН «Справа густу».
16.00 Прэм'ера. Меладрама «Рыта» (Расія).
17.45 «OFF STAGE LIFE».
18.05 Суперлато.
19.15 Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
20.30 «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
20.50 «КЕНО».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
22.30 «Сусветныя легенды. Эл Джэра ў Мінску».
00.10 Прэм'ера. Біяграфічная драма «Адгалоскі мінулага» (Вялікабрытанія- Іспанія).

### АНТ

07.00 АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
08.00, 09.00 Нашы навіны.
09.05 Нядзельная пропаведзь.
09.20 Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
09.55 «Шалапутныя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.15 Фазэнда.
11.50 АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
12.25 Камедыя «Сем нянек».
14.00 Прэм'ера. «Ян Арлазораў. Народны мужык Расіі».
15.00 АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
16.00 Нашы навіны.
16.15 Навіны спорту.
16.20 АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
17.25 «Эстрадны кактэйль».
18.45 АНТ прадстаўляе: «Зачыстка».
20.00 Контуры.
21.05 Фільм «Жаданне».
23.10 Ток-шоў «Кухня».
23.45 «Дэтэктар хлусні».
00.45 «Yesterday live».

### СТВ

05.30 Мультыплікацыйны фільм «Элька».
06.55 Фільм «Яе звалі Нікіта». Францыя - Італія, 1990 г.
09.00 СТВ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
09.30 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
10.50 «Вялікі сняданак».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.20 «Добры дзень, доктар!».
13.55 Фільм «Камедыя даўно мінулых дзён». СССР, 1980 г.
15.35 Ток-шоў «Лёс».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Праўда».
17.30 Канцэрт М. Задорнава.
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
20.40 Фільм «Двойчы ўчора». ЗША - Германія - Францыя - Вялікабрытанія - Іспанія, 1998 г.
22.40 Фільм «Амерыка супраць Джона Ленана». ЗША, 2006 г.
00.20 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

07.20 Дабравест.
07.45 Мір вашай хаце.
08.00 Рамантычная музычная камедыя «Рэальнае каханне-2» (Францыя).
09.45 Медычныя таямніцы.
10.25 Медычныя таямніцы +.
10.45 Тэлебарометр.
10.50 Школа рамонту.
11.55 Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
13.25 Мультфільм.
13.35 Бухта капітанаў.
14.15 Гаспадар.
14.55 Гандбол. Адборачны матч чэмпіяната Еўропы. Мужчыны. Беларусь - Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
16.30 Нашы тэсты.
17.05 «Правы чалавека».
17.20 Кінаспробы.
17.40 Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
18.40 Смешная часіна.
19.15 Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
20.15 «Навіны надвор'я».
20.40 Меладрама «Вялікія надзеі» (ЗША).
22.40 Культасвет.
23.10 Драма «Дзяўчына па выкліку» (ЗША).

### РОССИЯ

07.00 «Песні кіно». Творчы вечар.
09.15 Фільм «Калі б я цябе кахаў...». 2010 г.
11.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Уся Расія».
12.20 Фільм «Узнагародзіць (пасмяротна)».
14.00 Весткі.
14.15 «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
14.45 «Рамантыка раманса». Гала-канцэрт.
15.55 «Адгадаць лёс. Яўген Петрасян». Дакументальны фільм.
16.55 Фільм «Круг».
18.45 Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
20.00 Весткі тыдня.
21.05 Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
23.55 «Адмысловы карэспандэнт».
00.55 Фільм «Маналог».

### НТВ

07.40 Мультфільм «Чарадзейны пярсцёнак».
08.00 Сёння.
08.20 «У зоне асаблівай рызыкі».
08.45 «Іх норавы».
09.25 «Ямо дома!».
10.00 Сёння.
10.20 «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
10.55 Прэм'ера. «Баль на ўвесь свет».
11.55 «Дачны адказ».
13.00 «Сёння».
13.20 «Таямнічая Расія».
14.15 Камедыя «Удалы абмен».
16.00 Сёння.
16.20 «Развод па-руску».
17.20 «І зноў добры дзень!».
18.25 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.00 Сёння. Выніковая праграма.
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.50 «Цэнтральнае тэлебачанне».
22.05 Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
00.55 «Увага: Вышук!».
01.25 «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

09.30 Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
10.30 Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Сахір, Бахрэйн). 1-я гонка.
11.00 Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Сахір, Бахрэйн). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
11.45 Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
13.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем. Прамая трансляцыя.
15.00 Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 7-ы этап. Прамая трансляцыя.
16.00 Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130. Прамая трансляцыя.
17.45 Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету ў Германіі (Інцэль). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
19.00 Веласпорт. Велагонка Тырэна-Адрыятыка (Італія). 5-ы этап.
20.00 Тэніс. Турнір WTA у ЗША. Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
21.45 Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Эстафета.
22.30 Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
23.30 Тэніс. Турнір WTA у ЗША. Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
01.15 Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Эстафета.

### БЕЛСАТ tv

07.00 Аб'ектыў.
07.10 Еўропа сёння.
07.40 «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 2 серыя.
08.25 Зорны пірат», серыял: 7 серыя.
08.55 Калыханка для самых маленькіх.
09.25 « Расія. XX стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 2.
09.50 «Два-тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
10.55 «Супраць забыцця. След дыктатураў», дак. фільм, 2010 г., Францыя.
12.30 Два на два (тэледыскусія).
13.00 Еўропа сёння.
13.30 «Зорны пірат», серыял: 7 серыя.
13.55 Калыханка для самых маленькіх.
14.25 «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША.
15.50 Моўнік (лінгвістычная праграма).
16.05 «Ранча», серыял: 40 серыя.
17.00 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
17.15 «Час гонару», серыял: 18 серыя.
18.05 Дакументальная гадзіна: ««Курск» – субмарына ў каламутнай вадзе», дак. фільм, 2009 г., Вялікабрытанія.
19.20 Моўнік (лінгвістычная праграма).
19.40 Калыханка для самых маленькіх.
19.50 Гісторыя пад знакам Пагоні.
20.05 ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
20.30 Басаном па свеце (спазнаваўчая праграма).
21.00 Тыдзень у «Аб'ектыве».
21.30 Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
22.00 Фільматэка майстроў: «Заказное забойства», маст. фільм, 1984 г., Вялікабрытанія.
23.30 «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
23.40 Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Віцебск: (8 029) 3084978, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

ф. ПС 112

БЕЛПОЧТА

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

| Счет получателя | 3012741108019 | Лицевой счет | Код 739 |
|---|---|---|---|
| УНП* | 190790926 | | |

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Кассир

Пеня ______
Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

**www.novychas.org**

ГЕАПАЛІТЫКА

# ЛІВІЯ НАПЯРЭДАДНІ РАСКОЛУ

Алег НОВІКАЎ

**У заходняй прэсе з’явілася шмат публікацый пра тое, што Лівія як адзіная дзяржава дажывае апошнія дні. Быццам на яе руінах пасля падзення рэжыму Кадафі ўзнікнуць як мінімум дзве новыя краіны або кангламерат плямёнаў.**




Аўтары артыкулаў, якія прагназуюць хуткі крах Лівіі, прыводзяць два аргумента. Па-першае, як нацыянальная дзяржава Лівія не адбылася. Дасюль у аснове калектыўнай самасвядомасці на першым месцы стаіць прынцып прыналежнасці да якога-небудзь племені або клану. І толькі пасля — да лівійскай нацыі.

Па-другое, у краіне ёсць моцныя традыцыі сепаратысцкага руху, і перш за ўсё на Усходзе ў рэгіёне Кірэнаіка. Нагадаем, што сучасная Лівія ўзнікла як аб’яднанне трох розных сектараў — Трыпалітанія (Захад), Кірэнаіка (Усход) і Фезан (Поўдзень). Кожны з іх, аднак, мае свой уласны гістарычны шлях, свой культурны каларыт, формулу інтэграцыі ў глабальную эканоміку. Так, Кірэнаіка даўно звязаная з рынкам Егіпту. Трыпалітанія — з эканомікай Алжыра, а Фезан — з Тунісам.

Асобная роля ў сцэнарах развалу Лівіі адводзіцца Кірэнаіцы, якая цяпер стала цэнтрам паўстання супраць палкоўніка Кадафі. З Бенгазі мяцеж пашырыўся па ўсёй краіне. Тут жа, у Бенгазі, зараз ствараюцца інстытуты паралельнай улады ў выглядзе аргкамітэта Нацыянальнага народнага кангрэсу.

Кірэнаіка аформілася як асобны рэгіён яшчэ ў часы старажытнага Рыму. Варта згадаць, што ўжо тады правінцыя лічылася бунтарскай — тут быў адзін з цэнтраў рымскай рэспубліканскай апазіцыі, якая супрацьстаяла спробам ператварэння Рыму ў імперыю.

Хаця пасля прыходу арабаў усё хрысціянскае насельніцтва было прымусова пераселенае на Крыт або ў Сіцылію, рэвалюцыйная спадчына захаваліся. Якраз у Кірэнаіцы напачатку XX стагоддзя разгарнулася барацьба супраць італьянскіх каланізатараў, якія захапілі Лівію. У выніку барацьбы туземцы нават дамагліся стварэння фармальна незалежнай дзяржавы, якую ў 1920 годзе італьянцы ўсё ж ліквідавалі. Факт існавання дзяржаўнага фармавання меў вялікі ўплыў на далейшую гісторыю краю.

Дзяржавай кіраваў малады кароль Ідрыс. Пасля прымусовай ліквідацыі каралеўства ён па даўся ў Егіпет, дзе абвясціў сябе эмірам Кірэнаікі. На радзіму ён вярнуўся ў час вайны на штыках жаўнераў антыфашысцкай кааліцыі, якія змагаліся з Мусаліні. Саюзнікі ўзнялі яго статус да ўзроўню караля ўсёй Лівіі.

На гэтай пасадзе Ідрыс заставаўся да перавароту 1969 года. Вынікі яго кіравання вельмі супярэчлівыя: так, за ўсе гады манархіі ў краіне не было створана ніводнай ВНУ. У знешняй палітыцы каралеўства Ідрыса было марыянеткай Вялікабрытаніі. Аднак шмат хто з лівійцаў дасюль лічыць Ідрыса героем: пры ім прынамсі былі дазволеныя палітычныя свабоды і незалежная прэса. Таму цяперашнія паўстанцы ў якасці сімволікі выкарыстоўваюць менавіта стары сцяг лівійскай дынастыі.

Ёсць у спадчыне Ідрыса і негатыў, які ахвотна выкарыстоўвае лівійскай афіцыйная прэса. Кароль быў шчыльна звязаны з ісламісцкай сектай сенусітаў. Яны па сутнасці і каардынавалі антыітальянскае паўстанне пачатку XX стагоддзя.

У часы Кадафі ордэн сенусітаў быў забаронены, аднак цалкам знішчыць яго не ўдалося. Сёння сябры ордэна займаюць важнае месца ў шэрагах апазіцыі. Апошняе дае падставу Кадафі казаць пра тое, што выступы супраць яго замоўленыя быццам самім Бен Ладэнам. Кіраўнікі сенусітаў кажуць, што не падтрымліваюць ідэі ісламскага фундаменталізму.

Традыцыйна антаганістам Кірэнаікі з’яўляецца Трыпалітанія, адкуль паходзіць племя Кадафі. Аднак казаць пра тое, што ўсе мясцовыя кансалідаваныя вакол роду Кадафі, цяжка. Ягонае племя дастаткова малое і жыве вакол горада Сірд. Акрамя таго, яно знаходзіцца ў стане канфлікту з некаторымі суседнімі плямёнамі. Так, у 1993 годзе нарабіла шуму гісторыя пра арышт афіцэра з клану Магарыя (Magariha), які лічыцца заклятым ворагам племені Кхадаф (Khadafa) адкуль паходзіць Кадафі. Афіцэра абвінавацілі ў падрыхтоўцы дзяржаўнага перавароту і намеры забойства палкоўніка Кадафі.

Таксама Муамару цяжка абаперціся на сталіцу, якая даўно ператварылася ў своеасаблівы кацёл прадстаўнікоў розных плямёнаў. Больш таго, тутэйшыя таксама жадаюць рэвалюцыі. Племя, якое складае касцяк жыхароў сталіцы (прыкладна 30 працэнтаў) выступіла за рэформы.

Тое, што шматлікія плямёны сёння так хуценька сталі на бок паўстання, на думку аналітыкаў, доказ структурнага крызісу мадэлі Кадафі.

Калі палкоўнік прыйшоў да ўлады, перад ім стаяла задача аб’яднаць розныя плямёны вакол ідэі мадэрнізацыі. Дапамог сусветны нафтавы крызіс 1974 года, вынікам якога таксама сталі актыўныя геалагічныя разведкі па ўсім свеце. Нечакана ў Лівіі знайшлі каласальныя запасы чорнага золата, размеркаванне прыбыткаў з продажу нафты і гарантавала Кадафі лаяльнасць на месцах. Нагадаем, што кожны лівійскі грамадзянін мае права на бясплатную медыцыну, адукацыю і кватэру.

Другой цукеркай, якую кінулі правадырам кланаў, была прававая канцэпцыя «джамахірыі» (дзяржавы народных мас). Па сутнасці, гэта было прызнанне права плямёнаў на іх унутраную аўтаномію. Дарэчы, джамахірыя — правілы для плямёнаў — таксама існуе ў суседніх Тунісе і Егіпце.

Аднак гэтая формула грамадзянскага ўладкавання перастала працаваць, як толькі распачалася ўрбанізацыя. Адукаваныя жыхары гораду, перш за ўсё моладзь, маюць не толькі больш высокія спажывецкія амбіцыі, аднак таксама лепш усведамляюць паняцце грамадзянскіх свабодаў. Адсюль з’явіліся лозунгі кантролю грамадзян і плямёнаў за размеркаваннем прыроднай рэнты (зараз гэта манаполія людзей з атачэння Кадафі).

Калі пачалося паўстанне ў Бенгазі, плямёны сталі адным з полюсаў паралельнай дзяржаве ўлады.

Вяртанне плямёнаў у палітыку стварае шмат праблемаў для будучыні Лівіі. Ніякіх забабонаў на стварэнне сваіх дзяржаў большасць плямёнаў, як правіла, не мае. Аднак асаблівага жадання спрыяць дзяржаўнаму будаўніцтву Лівіі яны таксама не праяўляюць.

У гэтым парадокс лівійскага Левіяфану. На працягу стагоддзяў функцыі вышэйшай адміністрацыі бралі на сябе знешнія акцёры — туркі, італьянцы, брытанцы або апантаныя ідэямі арабскага сацыялізму афіцэры Кадафі. Грамадства жыло па сваіх законах, а дзяржава — па сваіх.

Якой будзе мадэль новай Лівіі, цяжка сказаць. Па логіцы, для захавання адзінства Лівіі патрэбны нацыянальны дыялог на ўзроўні як нацыянальнага прадстаўнічага органу, так і кансультацый паміж плямёнамі і кланамі.

Усе прызнаюць, што працэс будзе цяжкім. І Кірэнаіка, дзе папулярныя ідэі аўтаноміі, можа праявіць ініцыятыву да выхаду са складу краіны.

Аднак гэта будзе яшчэ горшым варыянтам. Межы паміж Кірэнаікай і Трыпалітаніяй дастаткова штучныя. Акрамя таго, тут знаходзяцца радовішчы карысных выкапняў. Таму абвяшчэнне незалежнасці Кірэнаікі гарантуе новы вайсковы канфлікт, незалежна ад таго, застанецца пры ўладзе Кадафі або не.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Масква таксама не даруе Лукашэнку. То ўся Беларусь глядзіць фільм «Хросны бацька» (РБ ветліва пусціла ў сваю інфармпрастору расійскія каналы). То да канца адпачынку «бацькі» ў расійскім інтэрнэце распаўсюджваюцца чуткі, быццам прэзідэнт Беларусі, спускаючыся з гары, зламаў шэсць-сем пазванкоў, атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і шпіталяваны ў крытычным стане. То хтосьці ў Маскве заявіць пра тое, што асуджае арышты ў Мінску. То раптам «расійскія сябры» Лукашэнкі спыняюць пастаўкі нафты ў Беларусь. Карацей, Расія дэманструе сапраўднае стаўленне да Лукашэнкі, які пайшоў на чацвёрты тэрмін. Аляксандр Рыгоравіч палітычна заціснуты і пры гэтым «адплёўваецца» направа і налева: у бок Еўропы і Расіі.

**«Дзеркало тижня» (Украіна)**

Палітыка Беларусі толькі тры гады таму пачала паварочвацца на Захад. Шмат у чым гэта вынік і таго, што на розныя пазіцыі ў беларускія міністэрствы, пасольствы і іншыя дзяржустановы прыйшло новае пакаленне: беларусы, народжаныя ў 1970-х — сярэдзіне 1980-х гадоў, светапогляд якіх сфармаваўся ўжо ва ўмовах беларускай дзяржаўнасці. Старая «савецкая гвардыя», якая яшчэ нядаўна займала большасць сур’ёзных пасад, па аб’ектыўных чынніках сыходзіць. Адпаведна, працаваць з Беларуссю Еўропе з кожным годам будзе прасцей, а Маскве — цяжэй.

**«Грузия сегодня» (Грузія)**

Лукашэнка асабіста казаў, звяртаючыся да палітвязняў, пра «тры пытанні і тры адказы, і вы — на свабодзе». І вось як з іх выбіваюць гэтыя тры адказы, адзін з якіх — «я пагаджаюся быць сексотам». Такім чынам рэалізуюцца словы: «я не буду ствараць апазіцыю». Класічная фраза: «Вось яна, лукашэнкаўская дэмакратыя» больш не пасуе. Гэтая ўлада перайшла яшчэ адну чырвоную рысу і пачала катаваць палітычных праціўнікаў. Такія дзеі падпадаюць пад самыя жорсткія міжнародныя санкцыі.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

У органах дзяржкіравання дэ-факта закупы за валюту ўжо забароненыя — прадпрыемствы могуць іх ажыццяўляць толькі па адмысловым дазволе кіраўніцтва адпаведных міністэрстваў і ведамстваў і толькі на новае абсталяванне ці крытычны імпарт. Верагодна, распараджэнне Лукашэнкі прывядзе да юрыдычнага афармлення практыкі. Неабходнасць абмяжоўваць выкарыстанне валюты паўстала з-за крытычнага стану аплатнага балансу краіны. Як паведамлялася раней, адмоўнае знешняе гандлёвае сальда па выніках 2010 года дасягнула 7,5 мільярда долараў, што на 36% больш, чым у 2009 годзе. Дэфіцыт у гандлі таварамі і зусім перавысіў 9 мільярдаў долараў. Калі раней асноўным чыннікам дэфіцыту аплатнага балансу была нізкая канкурэнтаздольнасць прадукцыі, то ў апошнія гады да яе дадалося зніжэнне прыбыткаў ад нафтаперапрацоўкі і падаражанне энергарэсурсаў. Павялічыўшы летась аб’ёмы вонкавых запазычанняў, урад вырашыў імгненную праблему недахопу сродкаў. Але ўжо да 2015 года Беларусь можа падысці з праблемай пагашэння знешніх абавязкаў, штогадовыя выплаты па якіх складуць 4 мільярда долараў.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЗША. ФСБ АРГАНІЗУЕ АМЕРЫКАНСКІ МАЙДАН



У той час, як усё чалавецтва ўважліва сочыць за Арабскай рэвалюцыяй, цікавыя падзеі развіваюцца ў ЗША. Як вядома, на нядаўніх выбарах у Кангрэс і Сенат ЗША перамаглі рэспубліканцы, адным з якіх з'яўляецца Скот Уолкер, губернатар штата Вісконсін. Каб прадухіліць фінансавы правал у 3,6 мільярда долараў, які чакае Вісконсін у 2013 годзе, новы гаспадар штата пачаў заўзята выпраўляць сітуацыю. Бюджэтны дэфіцыт было вырашана скараціць за кошт бюджэтнікаў. Акрамя гэтага Уолкер прапанаваў паменшыць датацыі на медыцынскую страхоўку і пенсійныя фонды дзяржслужбоўцаў, у парушэнне заключаных кантрактаў, і абмежаваць прафсаюзам права заключаць калектыўныя дамовы з працадаўцамі. 17 лютага ўсе гэтыя цудоўныя меры павінны былі быць разгледжаны ў сенаце штата, аднак тут адбылося нешта ніколі раней не бачанае. Натоўп бюджэтнікаў — лекары, настаўнікі, пажарныя і іншыя — уварваўся ў Капітолій штата, заклікаючы адправіць губернатара ўслед за Мубаракам. Народ блакаваў усе адміністрацыйныя ўстановы і не разыходзіцца некалькі дзён.

Тым часам Скот Уолкер, па чутках, плануе мабілізаваць нацыянальную гвардыю і збірае групы радыкалаў з Tea Party. Пакуль сітуацыя не зразумелая. Ходзяць чуткі, што беспарадкі перакінуцца на суседнія штаты. Прынамсі ў суседнім штаце Індыяна пачалося нешта падобнае. Самае цікавае, што ролю канала «Аль-Джазіра» ў паўстанні Вісконсіна адыгрывае расійскі англамоўны канал «Russia Today», які асвятляе падзеі. «Няўжо Лубянка арганізуе аранжавую рэвалюцыю ў Штатах?» — задаюцца пытаннем блогеры.

**По матэрыялах амерыканскай прэсы**

### КАЗАХСТАН. НАЗАРБАЕЎ ШУКАЕ СТАТЫСТАЎ НА ВЫБАРЫ

Казахскі ЦВК падвёў канчатковыя вынікі першага этапу выбарчай кампаніі. Вынікі не задаволілі ўладу: сур'ёзныя апаненты Нурсултана Назарбаева выбары праігнаравалі. Стаўка на дэманстратыўную перамогу над супернікамі дзейснага кіраўніка дзяржавы правалілася. Пасля таго, як стала вядома, што замест рэферэндуму адбудуцца датэрміновыя выбары, сярод прыхільнікаў Назарбаева пераважалі шапказакідальніцкія настроі. Сэнс іх быў наступны: Нурсултан Назарбаеў набярэ не меней 95% галасоў, апазіцыя не ў стане высунуць адзінага кандыдата, яна слабая, разрозненая і не ўяўляе пагрозы дзейнаму прэзідэнту. Аднак усё ідзе інакш, чым пралічвалі праўладныя паліттэхнолагі. Самыя вядомыя і аўтарытэтныя апаненты Назарбаева адмовіліся ісці на выбары. Цяпер Назарбаеву тэрмінова шукаюць статыста з лагеру «незалежных» кандыдатаў. Пакуль гэта нагадвае шоў. Нават чыноўнікі прызнаюць, што ў гэтых кандыдатаў «не ўсё ў парадку з галавой». Не вядома, як улады будуць выходзіць з сітуацыі. Пакуль яны называюць апазіцыянераў «пігмеямі» і кажуць, што не ўдзельнічаць у выбарах апазіцыянераў прымусілі нейкія замежныя цэнтры.

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### УКРАІНА. 399 АБЯЦАННЯЎ ЗА ГОД



У першую гадавіну прэзідэнцкай кадэнцыі Віктара Януковіча (інагурацыя адбылася 25-га лютага мінулага года) журналісты выдання «Украінская праўда» апублікавалі цікавыя статыстычныя дадзеныя. Аказваецца, за першы год Віктар Фёдаравіч умудрыўся даць 399 абяцанак. Фактычна па адным абяцанню на дзень. З іх, калі верыць выданню, ён выканаў толькі 17. Не выканаў 6. Астатнія пакуль знаходзяцца ў падвешаным стане. Нягледзячы на падыход газеты, лічбы адлюстроўваюць рэйтынг даверу да Партыі рэгіёнаў. Толькі за апошні тыдзень у краіне двойчы прагучалі заклікі да рэвалюцыі. Уладзімір Бойка, дырэктар металургічнага камбіната ў Марыупалі, заявіў, што ў выпадку перагляду прыватызацыі заводу (цяпер ён належыць працоўнаму калектыву) ён арганізуе «малінавую» рэвалюцыю. Папулярны публіцыст Андрэй Окара заклікаў жыхароў цэнтральнай Украіны ўзгадаць, што яны нашчадкі казакоў і махноўцаў, і выступіць супраць запланаванай рэформы ўзбуйнення раёнаў. За кошт гэтай меры ўлады намагаюцца скараціць колькасць бюджэтных ведамстваў (шпіталі, школы, бібліятэкі і г.д). Окара таксама спадзяецца, што паўстанне, якое пачнецца ў Палтаве або Чаркасах, зможа прымірыць Усход і Захад краіны.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

НА ЭКРАНАХ

# ЧОРНЫ ЧАЦВЕР

*Алег НОВІКАЎ*



**25 лютага ў польскі кінапракат выйшаў фільм «Чорны чацвер», прысвечаны трагічным падзеям 1970 года. Рэжысёр — Антоній Краўзе.**

Кароткая гісторыя падзей снежня 1970 года.

12 снежня 1970 года ўлады Польшчы прынялі рашэнне пра падвышэнне коштаў на прадукты. 14 снежня застрайкавалі працоўныя гданьскай суднаверфі імя Леніна. Адбыліся першыя сутыкненні з міліцыяй. У той жа дзень у Гдыні рабочыя прыйшлі да будынку гарсавета. Улады сустрэліся з дэлегацыяй працоўных, прызналі справядлівымі іх патрабаванні і падпісалі адпаведную дамову. Але познім вечарам таго ж дня сябры страйкаму былі арыштаваныя.

17 снежня з 5 гадзін раніцы на станцыю Гдыня-Суднаверф, як заўсёды, пачалі прыбываць электрычкі з працоўнымі. Аднак падыход да верфі быў перакрыты атрадамі вайскоўцаў. Кожныя шэсць хвілін электрычкі прывозілі новыя партыі людзей, праз паўгадзіны перон, чыгуначны мост і плошча перад станцыяй былі запоўнены натоўпам. І тут жаўнеры адкрылі агонь.

Бойня на чыгуначнай станцыі была пралогам вулічных баёў. 20 снежня быў скліканы VII пленум ЦК Польскай Аб'яднанай Рабочай партыі (ПАРП), на якім Уладзіслаў Гамулка быў зняты з пасады першага сакратара, а яго месца заняў Эдвард Герэк. Так пачалася новая эпоха, пазбаўленая, з аднаго боку, ілюзій адносна «народнай» улады, з іншага — эпоха адліку апошніх дзён Польскай Народнай Рэспублікі (ПНР).

Таму сімвалічная апошняя кадры славутага фільму «Чалавек з жалеза» Анджэя Вайды. Галоўныя героі сустракаюць навіну пра перамогу «Салідарнасці», а за кадрам гучыць «Легенда пра Янэка Вішнеўскага» — народная песня ў памяць ахвяр снежня 1970 года.

Стваральнікі фільма бачылі сваю задачу не ў тым, каб паказаць хроніку падзей, але і імкнуліся працягнуць справу героя снежня. Як заўважыў Антоній Краўзе, «для таго, каб заваяваць і ўтрымаць волю, неабходныя дзве абавязковыя ўмовы — праўда і памяць».

Таму, па словах рэжысёра, галоўным было стварэнне адпаведнага эмацыйнага паслання, якое б дапамагло гледачу адчуць атмасферу 1970-х. Для гэтага быў ужыты цікавы прыём, калі каляровая стужка сумяшчаецца з чорна-белымі кадрамі з архіваў.

Сцэнарысты і стваральнікі карціны імкнуліся адыйсці ад таннага пафасу. Героем «Чорнага чацвярга» яны зрабілі звычайнага рабочага, далёкага ад палітыкі. Ён жыве з сям'ёй і дзецьмі, марыць пра новую мэблю, радуецца, што застаўся дома і не пайшоў на дэманстрацыю, як іншыя. Аднак у выніку ўсё роўна становіцца ахвярай. Дарэчы, гэты герой мае канкрэтнага прататыпа.

**17 снежня з 5 гадзін раніцы на станцыю Гдыня-Суднаверф, як заўсёды, пачалі прыбываць электрычкі з працоўнымі. Аднак падыход да верфі быў перакрыты атрадамі вайскоўцаў**

Асобный фокус-групай для сцэнарыстаў была моладзь, якая ведае пра снежань 1970-га хіба што па падручніках. Слушнай аказалася ідэя зрабіць рок-версію згаданай вышэй «Легенды пра Янэка». Яе выканаў вядомы польскі музыка Казік Сташэўскі. На базе песні быў створаны кліп, які стаў трэйлерам фільму.

Наколькі ўдалася стужка? Мяркуючы па першых рэцэнзіях, фільм успрымаецца досыць пазітыўна: «Просты фільм, які хапае за горла», «Першы фільм, які дазваляе не толькі зразумець гісторыю ПНР, аднак і пачуць яе».

Ёсць і крытычныя водгукі. Аўтарам «Чорнага чацвярга» наракаюць, што яны занадта смакуюць расправу над дэманстрантамі з боку вайскоўцаў і супрацоўнікаў SB — аналагу КДБ у сацыялістычнай Польшчы. На экранах паказваюць, як людзей збіваюць палкамі, катуюць у камерах, вайсковымі штыкамі выразаюць з галоў шматкі скуры (гэта ўсё сапраўды было). Аднак не ставіцца пытанне, дзе крыніца гэтага садызму. Магчыма, гэта была праява істэрычнага страху перад народам: напярэдадні ў Гданьску працоўныя падпалілі партыйны абкам.

Крытыкі адзначаюць, што Краўзе ігнараваў версію, адпаведна якой Гамулка мог стаць ахвярай змовы фракцыі Герэка, што наўмысна штурхала лідара ПАРП да прыняцця непапулярных сілавых рашэнняў, каб у выніку адправіць таго ў адстаўку. Гучыць крытыка і на адрас акцёраў, якія выконваюць ролі партыйных функцыянераў. Шмат каму яны падаюцца занадта камічнымі.

«Чорны чацвер» стаўся падзеяй не толькі ў Польшчы. Для Беларусі і Украіны ён аказаўся надзвычай актуальным. Задоўга да прэм'еры ва Украіне і ў Беларусі з'явіліся публікацыі, прысвечаныя карціне і ўрокам 1970 года.

Калі ў Варшаве адзначалі ўгодкі снежня 1970-га, у Кіеве разганялі палатачны гарадок прадпрымальнікаў на Майдане і рыхтавалі крымінальныя справы супраць лідараў аранжавых. Знішчаюцца набыткі аранжавай рэвалюцыі, якую ў свой час параўноўвалі з забастоўкай «Салідарнасці». «Чаму палякі здолелі, а мы не?» — задаецца пытаннем газета «Дзеркало тижня», адзін з вядучых органаў апазіцыі.

У Беларусі ў снежні 2010 года адбыўся папросту нейкі рымейк польскай гісторыі, прычым у праекцыі, звязанай не толькі са снежнем 1970-га, але і снежнем 1981 года — увядзеннем вайсковага становішча і усталяваннем дыктатуры Ярузельскага.

Дарэчы, пра Ярузельскага таксама шмат гавораць у дэбатах, звязаных з фільмам. Непасрэдна на экране яго няма, хаця ў снежні 1970 года Войцэх Ярузельскі быў міністрам абароны. Сцэнарысты кажуць, што апусцілі яго постаць, паколькі канчатковыя рашэнні прымала Партбюро, сябрам якога Ярузельскі стаў пазней. Аднак шмат хто нагадвае, што без яго загаду вайскоўцы, якім было даручана патруляваць вуліцы, не атрымалі б камплекты баявых патронаў, якімі пасля стралялі па дэманстрантах.

Часам тая трагедыя набывала рысы камедыі. Адзін з асаў сучаснай польскай культуры Казік Сташэўскі з нагоды прэм'еры фільму даў газеце «Rzeczpospolita» інтэрв'ю. Аказваецца, у 1981 годзе ён збіраўся эміграваць у Лондан, каб працаваць на будоўлі. Нават білет ужо набыў. Аднак планы яго скасаваў вайсковы пераварот Ярузельскага. Так Казік не стаў брытанскім будаўніком, заняўся музыкай. «Па вялікім рахунку, — кажа Казік, — я заўсёды быў праціўнікам генерала Ярузельскага, аднак прыватна, у сувязі з тым, што ён не даў мне пакінуць край, удзячны яму».

Застаецца дадаць, што ніхто з тых, хто кіраваў масакрай у Гданьску, не быў асуджаны. Таксама, зрэшты, як і непасрэдныя выканаўцы загадаў, як і суддзі, якія прыгаворвалі людзей да турэмнага зняволення толькі за тое, што запалілі свечкі на станцыі Гдыня–Суднаверф у памяць ахвяр бойні.

Таму можна пагадзіцца з рэжысёрам Краўзе, які кажа, што «Чорны чацвер» — не канчатковы рахунак з гісторыяй. Грамадства яшчэ не зразумела цалкам маштаб трагедыі асобы ў час дыктатуры.

ВЫБАРЫ

# ШОЎ СТАТЫСТАЎ І ТРЫУМФ МОВЫ

Алег НОВІКАЎ

**Прызначаныя на красавік выбары прэзідэнта Казахстана пачынаюць нагадваць фарс. Кандыдатамі ў прэзідэнты Казахстана зарэгістраваны дзейны прэзідэнт і палітыкі, якія яго адкрыта падтрымліваюць.**







Пазачарговыя выбары прэзідэнта Казахстана, нагадаем, прызначаны на 3 красавіка. Ахвотныя заняць пасаду казахскага гаранта павінны прайсці тры этапы: 1) здаць іспыт на веданне казахскай мовы, 2) сабраць неабходную колькасць подпісаў у сваю падтрымку, 3) перамагчы на выбарах.

Першыя два этапы закончыліся 2 сакавіка. Іх змаглі пераадолець толькі чатыры чалавекі. Іншыя (усяго ў кандыдаты падалося 22 чалавека), былі адсеяныя. Прычым галоўным фільтрам аказаўся, як не дзіўна, не збор подпісаў, а іспыт на веданне мовы. Тэст завалілі аж 9 чалавек. Яшчэ пару кандыдатаў у кандыдаты ўвогуле спужаліся ісці на дыктоўку. У выніку на выбарчай дыстанцыі засталося 11 чалавек. З іх сабраць патрэбную колькасць подпісаў у сваю падтрымку здолелі толькі чатыры.

Кандыдатамі ў прэзідэнтамі зарэгістраваныя Нурсултан Назарбаеў, Жамбыл Ахметбекаў, Гані Касымаў, Мэлс Елеўсізаў.

Прозвішчы кандыдатаў, акрамя Назарбаева, наўрад ці нешта кажуць незаангажаванаму ў казахскую палітыку чалавеку. Таму ёсць сэнс пазнаёміцца з апанентамі Назарбаева бліжэй.

Жамбыл Ахметбекаў прадстаўляе Камуністычную народную партыю, Мэлс Елеўсізаў — экалагічны саюз "Табігат", Гані Касымаў ідзе ад Партыі патрыётаў Казахстану.

Парадаксальнай была рэакцыя пералічаных кандыдатаў на паведамленні пра іх рэгістрацыю. Замест таго, каб радавацца і праяўляць рашучасць пазмагацца з Назарбаевым, кандыдаты пачалі дружна апраўдвацца за свой учынак. Так, Елеўсізаў адразу заявіў, што не збіраецца перамагаць, а свой удзел у выбарах тлумачыць жаданнем "паўдзельнічаць у дэмакратычным працэсе".

Касымаў заявіў, што «абсалютна цвяроза глядзіць на рэчы, і тое, што ён не стане прэзідэнтам, — гэта відавочна».

І толькі Ахметбекаў заявіў, што канкурэнтаў на выбарах прэзідэнта яму няма.

Такая рыторыка сведчыць пра тое, што на самАй справе ўяўляюць сабой апаненты Назарбаева. Гэта людзі, якіх узялі ў кампанію, каб стварыць ілюзію нармальнага выбарчага працэсу.

Нічога іншага ў Назарбаева не заставалася. Раней апазіцыя адмовілася ад удзелу ў датэрміновых выбарах прэзідэнта Казахстана. Так, сацыял-дэмакраты з партыі «Азат» матывавалі сваё рашэнне адсутнасцю неабходнай колькасці часу на падрыхтоўку і заклікалі правесці выбары ў тэрміны, прадугледжаныя Канстытуцыяй краіны.

Адначасова некалькі апазіцыйных арганізацый заклікалі да байкоту выбараў прэзідэнта Казахстана і стварылі камітэт, у які ўвайшлі незарэгістраваная апазіцыйная партыя «Алга», Камуністычная партыя Казахстана, няўрадавыя арганізацыі «Ар. Рух. Хак», «Аман-саулык», а таксама асобныя грамадскія дзеячы, такія, як незалежны журналіст Сяргей Дуванаў, тэатральны рэжысёр Балат Атабаеў, апазіцыйны палітык Жасарал Куаньшалін.

Такая пазіцыя яўна не адпавядала планам прэзідэнцкай адміністрацыі. Там стаўку рабілі на тое, што апазіцыянеры не змогуць за кароткі час кампаніі высунуць аднаго кандыдата. Тыя, хто пройдуць у фінальную пульку, «элегантна» прайграюць Назарбаеву.

Аднак нечаканая апазіцыя абвясціла байкот. У такой сітуацыі ўладзе давялося шукаць статыстаў. Кастынг кандыдатаў нагадваў цырк. Акрамя пералічанай чацвёркі, у якасці кандыдатаў у кандыдаты рэгістравалі абы каго.

Так, на першым этапе ў спісе кандыдатаў фігуравалі дзве знахаркі-экстрасэнсы з вельмі арыгінальнымі праграмамі. Адна з іх казала, што ідзе на выбары, паколькі прыйшла эпоха Вадалея, і ў Казахстане павінен быць устаноўлены матрыярхат.

У кандыдаты кандыдатаў нават запісалі аднаго беспрацоўнага, які ў выпадку перамогі абяцаў даць кожнаму мужчыне законную каханку.

Натуральна, да фінальнай стадыі кампаніі такую дзіўную публіку не пусцілі. Абралі лепшых з горшых. Аднак такі расклад не пакінуў ніякай інтрыгі. Калі меркаваць па ўсіх незалежных апытаннях, людзі не вераць у апазіцыйнасць праціўнікаў Назарбаева. Яго перамога ўжо зараз не выклікае сумневу.

Адзінае пытанне: нашто Назарбаеву выбары, якія хутчэй ставяць пад сумнеў яго легітымнасць? Натуральна, тут ёсць шмат версій. У тым ліку кажуць па тое, што Назарбаеў страціў пачуццё рэальнасці, што яму вельмі важна захаваць стабільнасць перад стартам прэзідэнцкай кампаніі ў Расіі. Нарэшце, ходзяць чуткі, што прыдворныя алхімікі Назарбаева амаль знайшлі эліксір вечнага жыцця, пра які даўно марыць Нурсултан.

Аднак сярод гэтых версій ёсць адна цікавая. Аналітыкі кажуць, што прэзідэнту важна перамагчы да таго, як у Казахстане пачнецца прадуктовы крызіс, які ўжо падабраўся сюды з Азіі. Цяпер грашовых рэсурсаў у Астаны хапае выключна для таго, каб трымаць цяперашні ўзровень коштаў да красавіка, калі і адбудуцца выбары.

Пры ўсёй прадказальнасці цяперашніх выбараў у Казахстане, яны ўсё ж застануцца ў гісторыі. Дзякуючы таму, што дзяржава выкарыстала моўны іспыт як зброю супраць апазіцыі, у грамадстве вырасла цікавасць да ведання казахскай мовы. Шмат апазіцыянераў пачалі размаўляць на роднай мове, каб давесці свой сур'ёзны палітычны ўзровень і перастрахавацца ад таго, што ў будучым іх можна будзе штучна заваліць на іспыце.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ПЁТР НЕЧАС



Кіраўніцтва ліберальнай партыі Грамадзянская дэмакратычная партыя (ODS), лідэрам якой з'яўляецца прэм'ер-міністр Нечас, прыняла незвычайнае рашэнне: усе мясцовыя секцыі грамадзянскіх дэмакратаў, якія ўваходзяць у кааліцыі з прадстаўнікамі Камуністычнай партыі Чэхіі і Маравіі (KSCzM), павінны быць распушчаныя. На гэтым Нечас і кампанія не прыпыніліся. У пакеце была прынятая рэзалюцыя пра выключэнне з партыі 18 сябраў, якія блакіруюцца ў мясцовых саветах з камуністамі. Гэта вельмі радыкальны крок — у выніку партыя страціла свае фракцыі ў чатырох гарадскіх саветах. Па словах Нечаса, зачыстка не ёсць паляваннем на ведзьмаў. Хутчэй, гэта рэалізацыя пастановы апошняга кангрэсу ODS, які забараніў сваім сябрам блокі з KSCzM. Некаторыя грамадзянскія дэмакраты той наказ праігнаравалі. Акрамя таго, выключаныя з партыі, па словах Нечаса, могуць на працягу трох месяцаў аднавіць сваё сяброўства. Застаецца сказаць, што выключаныя дэпутаты заявілі як пра намер супрацоўнічаць з «чырвонымі», так і пра жаданне і заставацца сябрамі партыі. На іх думку, тое, што робіць Нечас, прадыктавана намерам адцягнуць увагу публікі ад праблемаў ураду.

### РУСТЭМ ХАМІТАЎ



Прэзідэнт Башкірыі спрабуе вырашыць вельмі балючае для Башкірыі моўнае пытанне. Пра праблему мовы пачалі казаць пасля таго, як у лютым у мясцовай прэсе з'явіўся адкрыты ліст супрацоўнікаў башкірскага тэлебачання. Аўтары сцвярджаюць, што ў рэгіёне пачаўся наступ на пазіцыі башкірскай мовы. Так, за мінулы год аб'ём вяшчання на башкірскай мове скараціўся на 5 працэнтаў. Ідзе перасьлед літаратараў, якія пішуць па-башкірску. Пратэст супрацоўнікаў тэлебачання стаў каталізатарам для актывізацыі татарскіх нацыяналістаў (татар у Башкірыі больш за прадстаўнікоў тытульнай нацыі). Яны традыцыйна выступаюць супраць таго, што дзяржаўнымі мовамі ў Башкірыі прызнаныя руская і башкірская. Два гады таму было ўведзена абавязковае вывучэнне башкірскай мовы ў школах, што выклікала пратэсты татар. Узнялі галаву і расійскія нацыяналісты. На іх думку, папулярызацыя башкірскай мовы, якая мала зразумелая большасці насельніцтва, спрыяе адчужанасці дзяржавы ад народа. Хамітаў, які аказаўся ў фокусе крытыкі розных партый, у выніку вырашыў рабіць стаўку на башкіраў. У інтэрв'ю ён адзначыў, што «башкірская мова на тэрыторыі Рэспублікі Башкартастан будзе вывучацца заўсёды».



### ВАЛЬДЭМАР ТАМАШЭЎСКІ

Партыя «Выбарчая акцыя палякаў Літвы» (AWPL), лідэрам якой з'яўляецца Тамашэўскі, паказала вельмі добрыя вынікі на мясцовых выбарах, якія адбыліся ў Літве 27 лютага. Так, у Віленскай ратушы AWPL стане другой фракцыяй (11 месцаў з 51-го). Больш таго, «палякаў» ужо запрасілі ў будучы гарадскі ўрад. Партыя палякаў таксама абараніла статус партыі большасці ў віленскім рэгіёне. Цікава, што на выбары партыя Тамашэўскага ішла разам з Саюзам расіян, які абараняе правы рускамоўных літоўцаў. У цэлым па краіне незвычайны картэль нацменаў атрымаў 6 працэнтаў. Каментуючы вынікі выбараў, Тамашэўскі звязвае поспех AWPL з рэпрэсіўнай палітыкай, якую кіруючы ў краіне ўрад кансерватараў праводзіць супраць нацыянальных меншасцяў. Што да саміх кансерватараў, то яны набралі 14 працэнтаў і сталі другой партыяй. Пераможцы — сацыял-дэмакраты, якія знаходзяцца ў апазіцыі (16 працэнтаў галасоў).

ЛЁСЫ

# ПРАСТОРЫ АЛЕСЯ ШАТЭРНІКА

**Не магу назваць гэта рэкламным буклетам, бо «Сонцакрыж» выходзіць за рамкі агульнапрынятых стандартаў. Як і сам вядомы скульптар Алесь Шатэрнік. Чаму? Адказ на гэта пытанне на вокладцы «Сонцакрыжа». «Жывапіс — гэта двухмерная прастора. Скульптура — трохмерная. Паэтычнае слова выходзіць па-за межы гэтых Прастораў і набліжаецца да чацвёртага вымярэння: Боскага Слова… «Напачатку было Слова…»**






## Першыя колеры

Карані мае з Беларусі. Бацькі былі амаль што мінчукі. Маці, Надзея Адамаўна, нарадзілася ў вёсцы Качына (Мінскае мора), а бацька, Сяргей Міхайлавіч — з вёскі Старына (каля Смілавіч). Цікава, што дзед і баба па ліні маці зваліся Адам і Ева. На жаль, яны сышлі вельмі рана, таму маці засталася сіратой яшчэ ў дзяцінстве. Але гэта стала не адзіным горам. Згарэла хата. Некаторыя шмат гадоў помнілі, як яна хадзіла па папялішчы і шукала сваю ляльку.

Маю такое меркаванне, што менавіта гэты пажар узгадваў у сваіх нататках знакаміты паэт Максім Багдановіч, які ехаў праз тыя мясціны ў цягніку.

А бацька мой быў з даволі заможнай сям'і. Дзед, Міхаіл Васільевіч Шатэрнік, быў галоўным рэвізорам Лібава-Ровенскай чыгункі. Калі я крыху падрос, то даведаўся, што ў бацькі быў родны брат, якога ён да самай смерці ў 1975 годзе па невядомай прычыне ніводнага разу не ўзгадваў. Старэйшы на шэсць гадоў.

Сястра Рая (нас было чацвёра) аднойчы мне сказала, што ён быццам бы жыве ў Балгарыі. На жаль, у 1967 годзе яе не стала. У савецкія часы, калі я яшчэ быў юнаком, шукаць сваяка за межамі краіны было не зусім бяспечна, але лёс даў мне магчымасць пераканацца ў тым, што гэта не фантазіі родных.

Адбылася сапраўды дзівосная гісторыя. У 2008 годзе на мяне па скайпу выйшаў Анастасій Шатэрнік. Пра яго я даведаўся, яшчэ два гады таму, калі быў у Амерыцы. Як і пра тое, што ён жыве ў Сафіі і, хутчэй за ўсё, з'яўляецца сынам былога расійскага скаўта Аляксандра Міхайлавіча Шатэрніка. Так потым і высветлілася. Магчыма, у гонар бацькавага брата мяне і назвалі.

Мінчуком я сябе лічу ўжо ў трэцім пакаленні. Тут была (каля Камароўкі) хата майго дзеда па лініі бацькі, і ён нарадзіўся менавіта тут, а я — у Іванава. Чаму? Молат сталінскіх рэпрэсій 1930-х гадоў добра вядомы. Натуральна, яны не маглі абмінуць і беларускую інтэлігенцыю, да якой належала і наша сям'я. Напрыклад, родны брат майго дзеда Мікола Шатэрнік быў вядомым беларускі мовазнаўцам. Яго прозвішча ёсць нават на мемарыяльнай шыльдзе, якая прысвечана Інстытуту беларускай культуры. Дарэчы, ён вельмі загадкава памёр. На аперацыйным стале… Як Фрунзе.

А майго дзеда спачатку па даносу пасадзілі, а потым выслалі ў Расію. Так ён трапіў на Волгу, а потым на будаўніцтва Балтыйска-Чарнаморскага канала. Каб быць бліжэй да яго, мы пераехалі ў Падмаскоўе. Бацька вучыўся ў Іванава ў медыцынскім інстытуце. Там я 16 кастрычніка 1940 года і нарадзіўся. На вуліцы Пушкіна. Адсюль і другая версія паходжання майго імя — Аляксандр Сяргеевіч.

Можа тады і хадзіць не ўмеў, але добра запомніў малюнак на нашым дыване. На цёплым ільняным палатне алейнымі фарбамі вылажаны нейкія геаметрычныя фігуры. Я іх магу намаляваць і зараз.

А яшчэ запомнілася, як бацьку праводзілі на фронт. Жылі мы тады ў горадзе Южы. Да чыгуначнай станцыі было каля 20-ці кіламетраў пехам. Дзесяць прайшлі разам, развіталіся, далей ён пайшоў сам.

Пазней маці распавядала, што, калі яго стала нябачна, раптам наляцела бура. Маці страціла прытомнасць і пачула нейкі голас, які сказаў, што з вайны муж вернецца жывым. Так пазней і адбылося.

Маці ў мяне была вельмі бавая і актыўная. У 1944 годзе яна напісала ліст Калініну, дзе распавяла пра сваё жыццё (трое малых дзяцей), і бацьку, які вызначыўся пры вызваленні Кёнігсбергу, на некалькі дзён адпусцілі «на пабыўку» дамоў. Памятаю, што я прачнуўся тады ад водару пакладзеных побач з маім ложкам пернікаў. Ноч. Маці з бацькам сядзяць на лаўцы, трымаюцца за рукі і аб нечым ціха размаўляюць.

Я быў вельмі жаласлівы і, каб маці не плакала, хаваў пад падушку кашулю бацькі, які хутка з'ехаў ваяваць.

## Першы выбар

Бацька (старшы лейтэнант, камандзір медсанбату) скончыў вайну ў Празе і даслаў нам адтуль ліст, у якім загадаў ехаць у Дубна (Заходняя Украіна), куды пераводзілі яго частку. Так і зрабілі. Пасяліліся ў былым панскім доме. Па гэты дзень памятаю тую шыкоўную мэблю і прыгожы посуд.

А саму частку размясцілі ў замку, які некалі належаў князям Астрожскім. Я нават маляваў розныя сюжэты з вакна бацькавага кабінета.

Пра бандэраўцаў раней казалі рознае, але маці з імі ладзіла і знаходзіла агульную мову. Гэта маё асабістае меркаванне, бо разумела, што ў савецкія часы пра гэта ніхто не распавядаў. У будынку, дзе мы жылі, былі падвальныя памяшканні, у якіх яны і хаваліся. Бандэраўцы нават дапамагалі маці калоць дровы. Чаму такое стаўленне? Таму што маці размаўляла на беларускай мове — сельскае выхаванне. А да астатніх «саветаў» стаўленне было адпаведным. Стралялі ва вокнах, памятаю, нават нейкага маёра забілі.

Менавіта тады, па сутнасці, і вырашыўся мой лёс. Пад самую раніцу альбо прывідзелася, альбо сасніласяя, што Хрыстос дае мне выбар: у левай руцэ — гармонік, а ў правай — аўтамат. Я выбраў гармонік.

Хаця і вайскоўцам ледзь не стаў. Бацька моцна хацеў, каб я вучыўся ў суворўскім вучылішчы. Я нават здаваў там іспыты і ледзь не пачаў вучыцца, але прыйшла «разнарадка», якая загадала тых дзяцей, у каго ёсць бацькі, забраць, і саступіць месцы дзетдомаўцам. Так я не стаў курсантам. Пашчасціла стаць мастаком.

Праз год мы з Дубны з'ехалі, бо бацька зволіўся з вайсковай службы, і апынуліся на Палессі, да якога ад Валынскай вобласці даволі блізка. Бацька стаў загадчыкам малярыйнай станцыі, бо тады там лютавала менавіта гэтая хвароба. Экспедыцыі адбываліся пастаянна.

Дарэчы, эпідэміёлагам ён стаў невыпадкова. Такі накірунак медыцыны абраў таму, што яшчэ на Волзе памерла ад малярыі двухгадовая дачка Ірачка. Яна нарадзілася значна раней, чым я.

…Памятаю, як мы лавілі і знішчалі вялікіх такіх камароў… На Палессі вельмі маляўнічыя і прыгожыя мясціны. Чыстая Прыпяць. Цёпла. Мы едзем у грузавіку і трапляем у нейкую глухую вёску. Дзеці там ніколі не бачылі цягніка, для іх дзівосам была нават наша машына. Я там упершыню ўбачыў драўляны ровар і вельмі быў уражаны тым, што вяскоўцы не ўяўляюць яго металічным.

Акрамя барацьбы з камарамі, мы былі павінны раздаваць людзям хінін. Жоўтыя такія таблеткі, надта горкія. Вяскоўцы, каб іх не браць, нават хаваліся.

Позняй восенню (ужо пачалі лятаць «белыя мухі») мы адтуль з'ехалі і апынуліся ў Мінску. Жылі ў Ратамцы, у мамінай сястры цёткі Ганны. Праз два гады малярыю перамаглі, і малярыйную станцыюператварылі ў Мінскую гарадскую санітарна-эпідыміялагічную станцыю. Мой бацька стаў там загадчыкам эпідэміялагічнага аддзелу, і яму далі асабістае жытло. Драўляны дом на ўскрайку Аўтазаводскага раёна. Чырвонае ўрочышча. Цяпер там вуліцы Ангарская і Дняпроўская.

У 1949 годзе я пайшоў у школу, адразу ў другі клас, бо чытаць і пісаць ужо ўмеў. Дарэчы, у мяне захаваўся фотаздымак тых гадоў. Я там амаль самы маленькі. Разам вучыліся хлопцы, якім ужо было 14–15 гадоў — вайна.

## Першыя формы

У продажы пачаў з'яўляцца белы хлеб. Памятаю, аднойчы мама дала мне пяць рублёў, каб я яго набыў. А я купіў… (смяецца) самакат. Маці прыказала яго вярнуць назад. Покуль ехаў да вясковых хлопцаў, якія мне гэта прадалі, ён разваліўся…

Асацыяцыйныя ўспаміны тых гадоў — вершы Твардоўскага, патэфон, лірычныя пасляваенныя песні, голас Леаніда Уцёсава.

У нас з'явіўся радыёпрымач, на якім былі кароткія хвалі. Памятаю, бацька паднімаецца ў шэсць гадзін раніцы, каб збірацца на работу (трэба было значна ехаць), брыецца, і гучыць «злоўленае» раней Бі-Бі-Сі альбо «Голас Амерыкі». Глушыць іх пачалі пазней. Так што іншадумцам я стаў ужо тады.



Напрыканцы 1951 года бацьку далі кватэру на вуліцы Гвардзейскай, што ў раёне Камсамольскага возера. У 37-й школе было дзве змены — рускамоўная і беларускамоўная. У апошнюю я і пайшоў. Дарэчы, калісьці мы размаўлялі з маім сябрам, вядомым графікам Яўгенам Кулікам. Высветлілася, што тады былі суседзямі. Ён хадзіў у «рускую змену», а «беларускім нацыяналістам» стаў раней за мяне — так што мова навучання не заўсёды хутчэй прыводзіць да нацыянальнай самасвядомасці. На жаль, у 2002 годзе Яўгена не стала.

Правучыўся я ў школе некалькі гадоў. Вельмі выдатна, дарэчы. З пахвальнымі лістамі за кожны клас. Потым было паступленне ў суворўскае вучылішча, пра якое ўжо ўзгадваў. Дзякуй Богу, лёс склаўся так, што вайскоўцам я не стаў. Пасля сямігодкі пайшоў працаваць на шпалерную фабрыку і ўвесь час марыў пра мастацтва.

У 1951 годзе пачаў займацца ў мінскім Палацы піянераў. Там у мяне быў настаўнікам Сяргей Пятровіч Каткоў. Вельмі цудоўны педагог, праз якога «прайшло» шмат выбітных беларускіх мастакоў — Данцыг, Паплаўскі і г.д.

Пасля была вучоба ў Мінскай мастацкай вучэльні. Першапачаткова пісаў заяву на скульптурнае аддзяленне, але мяне чамусьці адправілі на жывапіснае. Правучыўся там некалькі тыдняў.

Майго стрыечнага брата завуць Васіль. Ён старэйшы за мяне на два гады. Вучыўся «на скульптурным», куды хутка перайшоў і я. На трэцім курсе ў нас выкладаў былы франтавік Ігар Глебаў, пляменнік вядомага мастака Аляксея Канстанцінавіча Глебава, які заўсёды казаў: «Добрую прафесію абралі, будзе не толькі на хлеб. Але і на хлеб з маслам».

Скульптура мне спадабалася адразу. Сапраўдная мужчынская справа. Студэнты не толькі малявалі, але і ведалі, як працаваць малатком ці рыдлёўкай. Я звярнуўся да іх з пытаннем: «Хлопцы, можа хто жадае вучыцца на «жывапісным»?» Шчыра кажучы, на «скульптурным» (ва ўсе часы) жадалі вучыцца далёка не многія, таму шанцы ў мяне былі даволі высокія. Так і адбылося.

Летам 1962 года крыху папрацаваў мастаком-дэкаратарам у Рускім драматычным тэатры імя Горкага, які ў той час якраз збіраўся на гастролі. Справа ў тым, што тады студэнты браліся за любую работу, галоўнае — зарабіць грошы. І не для таго, каб іх потым «шумна пракуціць». Хацелася забяспечыць сябе і хоць нейкім чынам дапамагчы бацькам. Так я дакрануўся да таямніц сцэнаграфічнага мастацтва і быў моцна ўражаны. Там яшчэ захоўваліся традыцыі класічнага тэатра. Тым, хто вырас на выбырках сучаснага мадэрнізму, у такое нават цяжка паверыць.

Тэатр захапляў не толькі сустрэчамі са знакамітымі артыстамі і вядомымі людзьмі, але і зачароўваў нейкай сваёй таямнічай казкай. Яна была вакол, адчувалася сярод вялізных, замацаваных на сетках маляваных халсцін-кулісаў. Менавіта там я

і працаваў — рыхтаваў для спектакляў дэкарацыі.

Дарэчы, добра памятаю раманс з «Беспасажніцы» Астроўскага. Яго вельмі прыгожа спявала пайшоўшая з жыцця Аляксандра Клімава, а адным з двух студэнтаў, якія ёй акампанавалі на гітары, быў вядомы сёння спявак Віктар Скарабагатаў.

А праз год я працаваў мастаком у Акруговым Доме афіцэраў, рабіў там усялякую «афармілаўку». Аднойчы нават да мяне звярнуўся тагачасны адміністратар Моня Моніч і папрасіў напісаць афішу на канцэрт Шарля Азнавура. Тады я нават трапіў на галёрку. Цудоўны быў канцэрт. Асабліва ў параўнанні з савецкай эстрадай.

## Мазаіка жыцця

З далейшай вучобай мне крыху не пашчасціла. Справа ў тым, што ў 1964 годзе ў Тэатральна-мастацкім інстытуце закрылі аддзяленне скульптуры і станковага (музейнага, не вулічнага) жывапісу. Па сутнасці гэта альма-матэр выяўленчага мастацтва — жывапіс, малюнак і скульптура. Менавіта тады была разгорнута барацьба з так званымі «лішкамі ў архітэктуры», калі замест «сталінскага ампіру» паўсюды сталі будаваць пяціпавярховыя панельныя дамы, якія адразу назвалі «хрушчоўкамі».

Замест таго, што «скарацілі», з'явіўся манументальны жывапіс (цалкам непрымальны для мяне роспіс сцен), а таксама «кераміка» і «ўнутраная апрацоўка будынкаў». Апошнюю зараз называюць «дызайнам інтэр'ераў». Яе і абраў. Паралельна пачаў шукаць яшчэ і працу. Трапіў на Мінскую студыю тэлебачання, якая месцілася на Камуністычнай вуліцы. Тэлебачанне тады развівалася вельмі хутка, таму мне адразу прапанавалі стаць мастаком.

Вельмі цікавы там быў калектыў. Сапраўды — творчы. Па гэты дзень сябрую з Мішам Карпукомм. Канешне, адначасова вучыцца (вячэрняе аддзяленне) і працаваць было крыху складана. Асабліва, калі ўлічыць тое, што мяне даволі часта раілі прысутнічаць на перадачах, якія ішлі ў эфір менавіта вечарам. Урэшце час ад часу ў мяне з'яўляліся «хвасты».

Гэта і стала зачэпкай да майго выключэння. Дарэчы, тады з інстытута акрамя мяне выключылі яшчэ трох чалавек — Ларчанку, Гаркунова і Пазьняка. На той час рэктарам інстытута быў Захараў (па некаторых дадзеных, палкоўнік КДБ), але ён знаходзіўся ў адпачынку, і яго абавязкі выконваў выкладчык марксісцка-ленінскай эстэтыкі Старавойтаў. Ён і падпісаў той загад.

Праз шмат гадоў у яго трагічна загінула дачка Ірына Мятліцкая. Я доўга не трымаю крыўду на людзей. Падчас пахавання падышоў да яго, пацалаваў і выказаў сваё шчырае спачуванне. Ірына была вельмі таленавітая і напісала шмат чаго яскрава. Напрыклад, кніжку пра беларускага мастака Заборава, які зараз жыве ў Францыі. Мятліцкая мяне і натхніла ўзяцца за пяро.

Не магу сказаць, што выключэнне з інстытута стала вялікай трагедыяй. Для чалавека, які жадае быць скульптарам і ўжо мае адпаведны дыплом (пяць гадоў мастацкай вучэльні), вучоба інтэр'еру не можа быць чымсьці асабліва жаданым.

Менавіта ў гэты час скульптурнае аддзяленне вярнулі назад у інстытут, аднак я, як некаторыя мае сябры, не пажадаў, маючы за плячамі тры курса вячэрняй вучобы, пачынаць яе з нуля.

Замест гэтага ўладкаваўся на Мінскі скульптурны камбінат. І, як кажуць, пайшло-паехала. Удзельнічаў у розных выставах. Масква купіла маю скульптуру і запрасіла на стажыроўку.

Потым крыху папрацаваў у вядомых скульптараў Заіра Азгура і Ігара Глебава. А ў 1975 годзе ўступіў у Саюз мастакоў СССР. Адна мая работа з'явілася на вокладцы саюзнага часопіса «Творчасць», а другая трапіла ў знакамітую Трацякоўскую галерэю.

Скульптур зрабіў шмат. Арыгінальных. Нават Леніна на аўтамабілі. «Свабодныя навіны плюс» пажартавалі, што гэты быў першы «форд», які з'явіўся ў Савецкай Расіі.

У сярэдзіне 1970-х гадоў заказы, якія датычыліся скульптурных кампазіцый, размяркоўвалі мэтанакіравана. Адным з самых значных аўтарытэтаў у нашай галіне быў лаўрэат Ленінскай прэміі Сяргей Іванавіч Селіханаў. Менавіта ён зрабіў у Хатыні самы знакаміты там помнік — Камінскага, які выносіць з вогнішча на руках свайго сына. Селіханаў ставіўся да мяне з сімпатыяй, неаднаразова заходзіў у майстэрню. Мы нават сябравалі.

Калі з'явіўся заказ зрабіць скульптуры ў чатырох кропках Мінска, то ён адразу прапанаваў мяне і калегу па вучэльні Лёню Давідзенку. Гэты заказ «вісеў» доўга, бо яго не мог зацвердзіць мастацкі савет, таму што не знаходзіў нейкую агульную тэму.

На той час у Беларускім саюзе мастакоў ужо з'явілася групоўка, якая цікавілася нацыянальнай тэматыкай. Памятаю, аднойчы я звярнуўся за парадай да нашага вядомага мастацтвазнаўцы і мастака Віктара Шматава. Ён кажа: «Бяры нацыянальную тэму. Пабачыш, што пойдзе як па маслу». Сапраўды, так і адбылося.

Я пачытаў кніжку Ніла Сымонавіча Гілевіча «Беларуская вусная народная творчасць», дзе расказваецца пра чатыры беларускіх нацыянальных свята. Захапіўся гэтай ідэяй сам і заахвоціў ёй астатніх. Нават намаляваў калегам эскізы, а сабе абраў «Гуканне вясны». Каля Палаца спорту гэты дэкаратыўны фантан стаіць з 1980 года.

Потым былі «Вітаўт», «Мікола Гусоўскі», «Рагнеда», «Сямён Полацкі», «Максім Багдановіч», «Ефрасіння Полацкая», «Наталля Арсеннева», «Васіль Быкаў», розныя мемарыяльныя дошкі і яшчэ шмат чаго.

**Падрыхтаваў**
**Аляксандр Тамковіч**

КЛУБНАЯ ПАДЗЕЯ

# «БІТВА НА ДУДАХ»: FOLK V/S MEDIEVAL

*Анатоль МЯЛЬГУЙ*

**Зіма — не самы прадуктыўны сезон для айчынных дудароў. Кожны выканаўца шкадуе свой нятанны інструмент, які баіцца значных тэмпературных перападаў. Мо таму беларускія прыхільнікі дуды шукаюць новыя формы працы, якія б былі прыцягальнымі для слухачоў нават у марознае надвор'е. Адна з такіх форм — зімовыя сустрэчы выканаўцаў і слухачоў у рамках «Дударскага клуба».**

Нагадаю, «Дударскі клуб» пачынаўся як сустрэчы музыкантаў і прыхільнікаў дударскіх мелодый у адным са сталічных садоў каля цяперашняй Нацыянальнай бібліятэкі. Але там пачалося будаўніцтва мікраёна, і дудароў папрасілі пашукаць іншыя месцы для свайго музіцыравання і танцаў. Пазней былі сустрэчы дудароў у клубах «Катакомбы» і «Бастыён», у іншых месцах, ад якіх па розных прычынах давялося адмовіцца. І вось цяпер пакручасты лёс айчыннага музыканта прывёў выканаўцаў на дудзе ў сталічны клуб «Сфера», куды арганізатары «Дударскага клуба» запрасілі ўсіх ахвочых на такое арыгінальнае музычнае шоў, як «Бітва на дудах», ці «Дударскі батл»!

Ідэя «Бітвы на дудах» палягала ў тым, каб з дапамогай журы слухачоў высветліць, музыканты якіх напрамкаў — этнічнага ці медыевальнага — найбольш спрактыкаваныя для грання ўжывую, чые мелодыі слухачамі будуць найбольш запатрабаваныя для скокаў. Першымі ажывілі клубную атмасферу маладыя выканаўцы. «Медыевальны» напрамак своеасабліва на дудэльзаку прадставіў Яўген Бейня, які разам з бубначом гурта «Testamentum Terrae» Віталём «Астравітам» Касаўцом натхнёна граў знакамітыя еўрапейскія і беларускія сярэднявечныя кампазіцыі. Асабліва спадабалася слухачам у выкананні Яўгена папулярная мелодыя «Мазуля». Эстафета канцэрту-бітвы была перададзена «этнічнаму» дудару Антону Гліністаму, які ў народнай традыцыі сваімі скокамі з дудой на танцполе заахвочваў моладзь да большай разняволенасці і актыўнасці — напрыклад, з дапамогай жвавай і развясёлай «Лявоніхі»! А дапамагаў Антону ў гэты час адзін з арганізатараў «Дударскай бітвы», бубнач і дудар Яўген Барышнікаў.



Алесь Жура і Зміцер Шыманскі



Гурт «Квецень»

Зміцеру Сасноўскаму — лідару гурта «Стары Ольса» — пад сілу мелодыі як сярэднявечнага, так і фальклорнага напрамку. Але ў гэты вечар яму выпала быць апалагетам медыевальна-сярэднявечнага. У яго выкананні прагучалі шэраг сусветна знакамітых твораў: «Тотэнтанц», «Турдэон» і італьянская «Сальтарэла». Зміцеру супрацьстаяў таленавіты выканаўца Аляксей Лесавік, які адстойваў народныя карані дударскай традыцыі нашай Беларусі. Слухачы шчырымі апладысментамі ўспрынялі яго версіі фальклорных «Грачанікаў», іншых беларускіх танцавальных мелодый — «Лысага», «Ойры»...

Але ў гэты вечар не толькі дудары былі ў цэнтры ўвагі шматлікай моладзевай аўдыторыі. Арганізатары прадугледзелі шэраг нумароў, якія расквецілі і ўпрыгожылі праграму «Бітвы дудароў», а таксама далі магчымасць хлопцам і дзяўчатам адпачыць. Наведвальнікаў клуба «Сфера» чакалі танцавальныя нумары ў стылі фламенка, а таксама фальклорныя спевы ў выкананні гурта «Квецень». Яго ўдзельніцы заспявалі масленічныя песні, чым дадалі большай вагі дударам менавіта фальклорнага напрамку.

Знакаміты і тытулаваны беларускі выканаўца на дудзе Алесь Жура, які цяпер жыве ў Мазыры, заўсёды з задавальненнем адгукваецца на запрашэнні сяброў і грае ў рамках «Дударскага клуба» ці «Дударскага фэсту». Гэтым разам Алесь граў на французскай дудзе — cornamuse. Да таго ж, у дуэце з удзельнікам гурта сярэднявечнай музыкі «Cornu Copia» Зміцерам Шыманскім. Заўважу, што гэтым разам усе, хто прысутнічаў на «Бітве дудароў», больш слухалі, чым танчылі. Гэта таму, што моладзь захаплялі незвычайны тэмбр экзатычнага інструмента і выканаўчае майстэрства Алеся. Дарэчы, па агульнай згодзе А. Жура выходзіў на «поле бітвы» беларускіх дудароў двойчы, каб сваёй музыкай завершыць «Дударскую бітву».

Своеасаблівую сенсацыю стварыла ўдзельніца гурта «Стары Ольса» Марыя Шарый, якая прадставіла гучанне інструмента XXI стагоддзя, які вырабіў майстра А. Сурба — «гламурную» дуду. Спецыяльна для дзяўчыны яна была пафарбавана ў кіслотна-зялёны колер, бурдоны інструмента (не без своеасаблівага гумару!) упрыгожаны стразамі, а мех зроблены з касмічнага віду матэрыялу. Тым не менш, галоўнай на сцэне «Дударскай бітвы» была адна з першых беларускіх дзяўчын-выканаўцаў на дудзе — Марыя Шарый, якую слухачы больш ведаюць як флейтыстку «Старога Ольсы». Тым больш было прыемна адкрыць яшчэ адно імя на дударскай сцэне Беларусі.

Тлустую кропку ў фальклорнай частцы «Бітвы дудароў» выпала паставіць вядомаму беларускаму выканаўцу і майстру, лідару гурта «Testamentum Terrae» Юрасю Панкевічу. Сапраўды, Юрась славіцца сольным выкананнем народных мелодый, якія гучаць у яго інтэрпрэтацыі яскрава і віртуозна. Гэта якасць выканання вядомага дудара была ўзнагароджана гучнымі апладысментамі і ўзрадаванымі воклічамі моладзі «Брава!», якая з усё большым задавальненнем аддавала свае галасы фальклорным мелодыям.

Таму відавочна, што перавагі, якую набылі выканаўцы сярэднявечнай музыкі ў пачатку бітвы, не хапіла, каб атрымаць перамогу ў першай беларускай «Бітве дудароў». Але і аўтарытэту Юрася Панкевіча таксама неставала, каб «фальклорная» супольнасць дударскага руху святкавала сваю «вікторыю». Пасля падліку галасоў і гарачых спрэчак, арганізатары «Бітвы дудароў» абвясцілі пра баявую нічыю, у якой перамагло сяброўства тых, хто на сто адсоткаў аддае сябе адраджэнню айчыннай дударскай школы ва ўсіх яе праявах.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# БЕЛАРУСКАЕ АДРАДЖЭННЕ

Аляксей ХАДЫКА

**27 лютага ў кавярні «Добрыя мыслі» адбылася афіцыйная прэзентацыя чацвёртага па ліку альбома Таццяны Беланогай.**

Выканаўца — заўважны прадстаўнік сучаснай бардаўскай песні Беларусі. У большасці сваіх твораў Таццяна з'яўляецца аўтарам музыкі і словаў. Таксама яна выконвае на ўласную музыку вершы такіх выбітных паэтаў, як Максім Багдановіч, Яўгенія Янішчыц, Анатоль Сыс, Данута Бічэль, Чэслаў Мілаш.

Прага вандраванняў кіравала яе не толькі ў навуку і падарожжы, а і ў вывучэнне навакольнага свету і свету чалавека праз паэзію і музыку. Яе творчым павадыром зрабіўся таксама прысутны на канцэрце мэтр аўтарскай песні Алесь Камоцкі. Так нарадзілася новая — заўважу з мужчынскім эгаізмам — пяшчотная і паэтычная, але выразна моцная характарам музычная зорачка.

Новы альбом выдаўся вельмі роўны па якасці выканання і паэзіі, але, магчыма, трошкі пазбаўлены драматычных акцэнтаў, звычайна характэрных для творчасці Беланогай. Што тут скажаш — магчыма, у чалавека ўсё добра ў асабістым жыцці, і таму напал пачуццёвага надрыву часова сыходзіць? Калі так, парадуемся, бо навошта нам гэтыя блюзавыя інтанацыі: як гавораць, блюз — гэта калі добраму чалавеку кепска.

У выніку наведвальнікі канцэрта сышліся на тым, што другая частка імпрэзы, складзеная з выбраных твораў, уражвала мацней. Але ж гэта — выбранае. У новым альбоме таксама хапае кампазіцый, поўных напятага пачуцця. Як, прыкладам, «Белае воблака» — прысвячэнне Алесю Адамовічу. Ці «Каменны горад» — разважанні на блізкія Таццяне тэмы пра сэнс жыцця і, можна сказаць так, Боскай праўды ў ім. Дарэчы, выкананне аўтарскіх песень на прэзентацыйным канцэрце вельмі гарманічна дапаўняла яшчэ адна гітара і скрыпка.

Атмасфера кавярні «Добрыя мыслі» выдатна спрыяла прэзентацыі: канцэрт адбываўся на фоне мастацкай выставы Алены Старыкавай. У кавярні апошнім часам «прапісаўся» клуб бардаўскай песні БДУ, музычныя сустрэчы адбываюцца вельмі часта, раім нашым чытачам сачыць за афішай гэтай гасціннай установы. Раней Таццяна Беланогая, універсальны ў творчасці чалавек, там рабіла экспазіцыю сваіх малюнкаў, а на канцэрце прапаноўвала зробленыя з іх эстэтныя паштоўкі. Вось такі своеасаблівы «рэнесансавы ўніверсалізм» у творчасці рэпрэзентуе сабою Таццяна. Што ж, вітаем чарговае беларускае Адраджэнне.

Дадамо, што альбом «Ніткі» з 14 кампазіцыямі Таццяна запісала ў 2010 годзе. Канцэпцыя альбому, як заўважае аўтарка, — паказаць нябачныя повязі паміж людзьмі ў межах сям'і, краіны, сусвету. На дыску змяшчаюцца пераклады тэкстаў песень на польскую і англійскую мовы, кліп Настассі Маркавай «Да цябе» (2010).

ВЫСТАВА

# ВЯСНА І «ЖАНОЧЫ КАНТЭКСТ»

Аляксей ХАДЫКА

**Галерэя «Ў» чарговы раз прыцягнула ўвагу гледачоў выставай адметнага «нешараговага» творцы.**






Фота аўтара

Адкрыццё экспазіцыі жывапісу Сяргея Грыневіча «Жаночы кантэкст» зноў сабрала вытанчаную і цікавую аўдыторыю: шмат мастакоў, крытыкаў, аматараў мастацтва, а таксама кіношнікаў, літаратараў, фатографаў, журналістаў і іншых творчых асоб.

Галерэя апрача выставачнай дзейнасці працягвае ўпарта ўвасабляць сваю канцэпцыю пляцоўкі для культурнай камунікацыі. Вось і зараз, насуперак яе недзяржаўнаму статусу, на адкрыццё амаль у поўным складзе прыйшло кіраўніцтва Саюза мастакоў, а таксама дырэктар Нацыянальнага мастацкага музею Уладзімір Пракапцоў. А сам акт адкрыцця быў нефармальна сціплым. Кіраўніцтва галерэі падзякавала аўтару за яго згоду прадставіць свае працы менавіта ў залах «Ў», а мастак з цеплынёй адзначыў праяўленую да яго ўвагу: маўляў, навязваць сваю творчасць камусьці не ў яго правілах. І таму ён выстаўляе карціны толькі ў выпадку ветлівага запрашэння.

Вольга Грыневіч, культуролаг і куратар экспазіцыі, так сфармулявала асноўны пасыл арганізаванай ёю разам з мастаком Сяргеем Грыневічам творчай акцыі: «Сёння вельмі складана знайсці сябе, спыніцца і паглядзець углыб, зняць з сябе павярхоўную мішуру і агаліць свае думкі і жаданні. Наколькі часта ты лічыш за лепшае адправіць смс ці патэлефанаваць сябрам або сваякам, замест таго, каб асабіста сустрэцца? Ці часта ты адсылаеш шаблонныя смс і віншаванні, спампаваныя з інтэрнэту? І дзе ж тады ты сапраўдны ва ўзаемадачыненнях са сваімі блізкімі?»

Творы жывапісца — вялікафарматныя карціны, выкананыя акрылавымі фарбамі, апелююць да стылёвай спадчыны поп-арта, ставяць гэтыя ж пытанні ў пластычнай форме. Самотная адзінота святаў: жаночы і мужчынскі вобразы ў дыпцыху «Дзень св. Валянціна» выключна трагічныя. Яна — з тварам, заблытаным у стужцы сэрцаў-гламурак, як у вісельнай пятлі. Ён — адвярнуўшыся ад гледача, з паднесеным да скроні пісталетам. Перавёдзеная ў наўмысна атрутныя зеленаватыя колеры біблейская тэма грэхападзення з Адамам і Евай пры дрэве спазнання — як дыягназ сучаснага грэхападзення ў багну ўніфікацыі і штампаванасці.

Выстава не толькі апелюе да пазнавальных культурных кодаў чалавецтва, але і змяшчае іх у такой паслядоўнасці, якія правакуюць наведвальніка на разважанні і змушаюць задумвацца. Такім чынам, выстава Грыневіча — не для адпачынку, але для духоўнай працы, што варта адзначыць з выразным задавальненнем.

Апошнія гады мастак жыве паміж Беларуссю і Швейцарыяй, але не адасабляецца ад айчыннага творчага працэсу. Акрамя шматлікіх экспазіцый за мяжой, ён браў удзел і ў такіх знакавых праектах, як «Беларускі павільён 53-й Венецыянскай біенале» ў БелЭкспа ў Мінску, а таксама ў фестывалі сучаснага мастацтва «ДАХ» (абодва — 2009 год). Экспазіцыя працуе па 14 сакавіка.

ПАМЯЦІ

# СЫШОЎ ТВОРЦА КІНАСАНЕТАЎ

**2 сакавіка, на 71-м годзе жыцця, памёр беларускі кінарэжысёр Валерый Рубінчык.**



Валерый Рубінчык нарадзіўся 17 красавіка 1940 года ў Мінску. Ён вучыўся ў 42-й мінскай школе, у 1962 годзе скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, а ў 1969-м — Усесаюзны дзяржаўны інстытут кіно (майстроўня Якава Сегеля).

На кінастудыі «Беларусьфільм» ягоныя працы адразу прыцягнулі ўвагу далікатным аўтарскім почыркам і паэтычнай празрыстасцю кінаформы. Нават распавядаючы пра камсамольцаў і агітатараў, рэжысёр ствараў паралельны свет кінамастацтва і настальгіі па прыгажосці.

У стужцы «Чырвоны агітатар Трафім Глушкоў» (1969) паўстае гераічны кінамеханік, «Апошняе лета дзяцінства» (1974) здзіўляе тонкай ірoніяй і карункавымі кінакадрамі, а «Культпаход у тэатр» 1982 года — трагікамічнае даследаванне жыцця і мастацтва.

Ад «стабільнай» савецкай рэальнасці творца сыходзіў у літаратурную класіку («Гамлет Шчыгроўскага павету» 1975 года — драма паводле апавядання Івана Тургенева), фальклорную даўніну («Магіла льва» 1971 года — па беларускіх легендах і творах Янкі Купалы).

На студыі Рубінчыка называлі «фелінішчыкам» — за любоў да вытанчанай барочнай кінафармы. Але, у адрозненні ад карцінаў Федэрыка Феліні, стужкі Рубінчыка — стрыманыя і ціхмяна-меланхалічныя.

Адна з вяршыняў Рубінчыка — і дзівосны мастацкі эксперымент — «Вянок санетаў» 1976 года. Рубінчык пабудаваў ваенны фільм, у якім гучаць вершы Бэлы Ахмадулінай, як вянок санетаў, дзе канец аднаго верша ёсць пачаткам наступнага.

Дасціпны Уладзімір Караткевіч склаў на гэты конт эпіграму:

*Рубінчык — гэта галава,*
*Дазвольце мне сказаць аб гэтым.*
*Ён схараніў у «магіле льва»*
*І сатварыў «вянок санетаў».*

З Караткевічам Рубінчык працаваў над экранізацыяй «Дзікага палявання караля Стаха». Адразу па выхадзе ў 1979 годзе стужка была аблашчаная на міжнародных фэстах і ўвайшла ў даведнікі па страшнаму кіно. На радзіме гэты гатычны дэтэктыў калі і паказвалі, то асцярожна.

На сённяшні дзень гэта лепшая экранізацыя Караткевіча, хаця сам пісьменнік выказваўся стрымана: «Мы бачылі розныя сны». Сны Рубінчыка — з рапідам, каляровымі фільтрамі, ссохлым дрэвам, што падае на балоце, ледзяной і выпаленай зямлёй (знойдзенай на ваенным палігоне).

Рубінчык перанёс дзеянне «Дзікага палявання» ў 1900 год, зарыфмаваўшы гісторыю Караткевіча, дэкаданс, батлейку і новую эпоху страшных падзей.

Рубінчык збіраўся працаваць і над іншым сцэнарам Караткевіча — па Ядвігіну Ш. Але лёс не склаўся.

Апошняя стужка Рубінчыка на «Беларусьфільме» — «Камедыя пра Лісістрату» 1989 года паводле Арыстафана. Надалей творца пераехаў у Маскву. Беларуская кінаіндустрыя развальвалася, творца з унікальным пазіркам стаўся залішнім.

У Маскве Рубінчык выкладаў ва Усесаюзным дзяржаўным інстытуце кіно, а калі атрымлівалася з прадзюсерамі, здымаў рэдкія стужкі: «Пейзаж з трыма купальніцамі» (1995); «Мастак Барыс Забораў» (1996). Але далікатныя рубінчаўскія медытацыі «кіно пра кіно» (назва стужкі 2002 года) выпадалі з сучаснай расійскай эпохі (у Беларусі творца не зняў бы і гэтага).

На апошнім «Лістападзе» было падрыхтаванае запозненае ўшанаванне майстра. Але ён ужо не прыехаў. Сёння беларускага рэжысёра Валерыя Рубінчыка не стала. Ягоная далікатная кінапаэзія засталася.

**Андрэй Расінскі**

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 235

Падпісана да друку 04.03.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.